Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактора—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: Па 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Цана асобнага нумару: звычайнага — 20 к. тысковыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шматрэдкі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шматрэдкі пасьлядо тэксту 1 р. — к. За радок шматрэдкі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяткныя на 50 проц. дарожэй. Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент . . . 35 коп. За кожны дадатковы . . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 45 (2233) Серада, 22-га лютага 1928

Пленум ЦКК КП(б)Бел.

СКЛІКАЕЦЦА НА 1 САКАВІКА 1928 ГОДУ.

Павестка дня пленуму:

1. Аб рабоце ЦКК НКРСІ ў сувязі з рашэньнямі XV зьезду УсеКП(б)—(дакладчык тав. Калнін).
2. Скарачэньне 20 проц. адміністрацыйных выдаткаў—(дакладчык тав. Элькінд).
3. Даклад аб рабоце Менскай АКК КП(б)Бел.—(дакладчык тав. Мундау).
4. Шляхі палепшаньня пастаноўкі ведамсьцьвеннай рацыяналізацыі—(дакладчык тав. Ракаў).

Старшыня ЦКК КП(б)Бел КАЛНІН.

Недапусьцімая адцяжка.

Агульныя палітычныя задачы нашай работы ў вёсцы—напружанасьць дзяржаўнага і мясцовага бюджэтаў і неабходнасьць аабясьпечыць нармальнае разьвіцьцё багатоўчых апэрацый—усё гэта вымагае ад нас поўнага і своечасовага збору сельска-гаспадарчага падатку ў тэрміны, прадугледжаныя законам. Ня гледзячы на значны рост усіх і асабліва грашовых прыбыткаў сялянства, сел-гасп. падатак сёлета застаўся амаль у мінулагодніх разьмерах і фактычна стаў больш мёгкім, чым у мінулым годзе. Па асобных сацыяльна-эканамічных групах вёскі ён разьмяркован значна больш правільна. 39,3 проц. гаспадарак, г. зн. беднота і частка незаможных серадняко́ў—выкладены ад падатку; заможная верхавіна плаціць больш, чым у мінулым годзе. Тэрміны аплаты падатку расьцягнуты амаль на паўгода і зусім не зьмяўляюцца цяжкімі. А таму ўсякі недабор сум сельска-гаспадарчага падатку ў вызначаныя тэрміны нельга пічым апраўдаць і прыходзіцца тлумачыць толькі нясур'ёзнымі адносінамі адпаведных акруговых і раённых органаў да важнейшых задач нашай работы ў вёсцы.

Сводка паступленьняў сельска-гаспадарчага падатку на 15-га лютага выклікае самую сур'ёзную небясьпеку. Сельска-гаспадарчую кампанію мы абавязкова павінны скончыць без нядоімкі ў тэрмін—да 1-га сакавіка. Між тым за 2 тыдні да гэтага тэрміну па БССР выканана ўсяго 91,9 проц., а ў Гомельскай, Менскай і Магілеўскай акругах, якія спачатку кампаніі спаборнічаюць за апошнае месца — у 1-й—87,3 проц. у 2-й—88,4 проц. і ў 3-й—90,0 проц. Толькі па Бабруйскай і Мазырскай акругах кампанія праходзіць нармальна і застаецца да выканаўня ў першай—3,1 проц., а ў другой—3,2 проц. заданьня. Але посьпех работы гэтых округаў паралізуецца недаборам па іншых падатках, і ў выніку пры існуючым тэмпе паступленьняў задача збору 100 проц. падатку да 1-га сакавіка будзе сарвана.

Апарату неабходна падцягнуцца. Акрфінаддзелы, РВК і сельсаветы павінны ўзяцца як след за збор сельска-гаспадарчага падатку, успомніўшы тыя гады, калі значна больш цяжкія заданьні выконваліся в большым посьпехам. Ёсьць яшчэ адна прычына сьпяшацца. Надыходзіць час перагляду сел.-гасп. падатку, рэканструкцыі агульных разьмераў і разьмеркаваньня яго. Надыходзячы апэрацыйны год абяцае быць нялёгкім для апарату і патрабуе грунтоўнай падрыхтоўкі задоўга да пачатку работы. А такая падрыхтоўка немажлива пры наяўнасьці недаборaў у мінулую кампанію.

Акруговыя і раённыя органы павінны зараз-жа ўзяць курс на самую жорсткую падатковую дысцыпліну. Вызваліўшы ад падатку 39,3 проц. гаспадарак, зьменшыўшы падатак серадняку, мы не павінны быць вельмі далікатнымі ў ужываньні да заможных недаімшчыкаў рэпрэсій, прадугледжаных законам. Апісаньне з папярэднім выняцьцем апісанай маемасьці, адданьне пад суд злосных плацежаздольных неплацельшчыкаў арганізацыя хуткага і паказальнага разбору судом спраў аб сельска-гаспадарчым падатку,—усе гэтыя меры трэба ўжыць неадкладна і рашуча. Нельга зачыняць вочы на нядбайнасьць і бязьдзейнасьць некаторых РВК і сельсаветаў. У адносінах да іх павінны быць ужыты больш суровыя меры, чым у адносінах да недаімшчыкаў. Толькі неадкладны і рашучы пералом у працы на зборы сельска-гаспадарчага падатку забясьпечыць выкананьне яго ў тэрмін на 100 процантаў.

НОВАЕ „РАЗБРОЕНЬНЕ" ПАЧАЛОСЯ.

СЭСІЯ КАМІСІІ БЕЗАПАСНАСЬЦІ ПРЫ ЛІЗЕ НАЦЫЙ.—З НЯМЕЦКІЯ ЎМОЗЫ ДЛЯ АДХІЛЕНЬНЯ ВАЙНЫ.—РОЗНАГАЛОСЬСІ Ў РАЗГАРЫ

ЖЭНЕВА, 20-II. Сёньня ў 11 гадзін раніцы пад старшынствам Бенеша адчынілася другая сэсія камітэту па безапаснасьці і арбітражы.

* * *

ЖЭНЕВА, 21-II. На ўчарайшым вячэрнім пасяджэньні камісіі па безапаснасьці першы выступіў нямецкі дэлегат Сіманс, які падкрэсьліў, што, на думку Нямеччыны, усе бяз выключэньня міжнародныя спрэчкі, а асабліва палітычныя спрэчкі, здольныя выклікаць узброены канфлікт, павінны вырашацца мірнымі спосабамі. Дзеля гэтага ад імя нямецкага ўраду Сіманс прапанаваў ухваліць 3 пастановы, сутнасьць якіх такая: папершае, у выпадку канфлікту між дзьвума ці некалькімі дзяржавамі рада Лігі Нацый мае права ўхваліць папярэднюю пастанову наконт недагаворанасьці, якая выклікала канфлікт, гэтая папярэдняя пастанова зьяўляецца абавязковаю для ўсіх дзяржаў, замешаных у спрэчках; падругое, у выпадках калі падрыхтоўваецца ўзброеная стычка між рознымі дзяржавамі, рада Лігі Нацый мае права абавязаць усе гэтыя дзяржавы захаваць сучасны стан і становішча іх узброеных сіл (г. зн. не праводзіць мабілізацыі, не перагрупоўваць войска і г. д.); патрэцяе, у выпадку, калі ваенныя апэрацыі ўжо распачаліся, рада Лігі Нацый мае права абавязаць ваюючыя дзяржавы неадкладна замірыцца.

Пасьля Сімаанса выступіў японскі дэлегат Сато, які заявіў, што японскі пункт гледжаньня па пытаньні аб безапаснасьці супадае з ангельскім. Адначасна Сато зазначыў, што ён лічыць вельмі каштоўнымі думкі Сімаанса.

Пасьля Сато выступіў польскі дэлегат Сокаль, які поўнасьцю абараняў французкі погляд аб патрэбе ўтварыць гарантыйныя ўгаворы між асобнымі дзяржавамі, а таксама ажыцьцёвіць праэкт аб фінансавай дапамозе дзяржаве, на якую нападаюць.

Пасьля выступленьня Сокаля пасяджэньне было зачынена.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ГРЭЦКІХ КАМУНІСТАЎ?

ВЕНА, 20-2. У балканскім друку агалошана паведамленьне паліцыі, што 17 лютага ўвечары адбылася нарада камуністычных лідэраў Салонік і ваколіц, на якой быў выпрацаваны мэмарандум міністэрству ўнутраных спраў з патрабаваньнем неадкладна палегчыць падаткі. У выпадку адхіленьня гэтага патрабаваньня нарада, нібыта, ухваліла „арганізаваць у Салоніках і ваколіцах такое-ж паўстаньне рабочых і сялян, як на Крыце".

У Салоніках учынены шматлікія арышты.

Буйная выбарчая перамога кампартыі ў Гамбурзе.

САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ СТРАЦІЛІ 1000 ГАЛАСОЎ.—СКАНДАЛ ДЛЯ УЛЬТРА-ЛЕВЫХ.

БЭРЛІН, 20-II. Учора ў Гамбурзе адбыліся муніцыпальныя выбары, назначаныя ў зьвязку з скасаваньнем выбараў 9-га кастрычніка 1927 г. Выбары гэтыя былі скасаваны з прычыны абскарджаньня іх дробнымі партыямі, якія пратэставалі проці патрабаваньня ад іх грашовага закладу і падачы ня менш 3-х тысяч подпісаў, як умовы рэгістрацыі выбарчага сьпісу.

Кампартыя атрымала на ўчарайшых выбарах **114 тысяч галасоў—на 4 тысячы галасоў больш, чымся на выбарах у кастрычніку 1927 г**, Лік галасоў, пададзеных учора за камуністаў, перавышае лік галасоў, атрыманых камуністамі ў Гамбурзе на выбарах у рэйхстаг у маі 1924 г. якое было да гэтага часу рэкордным. За сацыял-дэмакратаў было пададзена 246 тысяч галасоў проці 247 тысяч у кастрычніку 1927 г. З буржуазных партый паражэньне панесьлі нацыяналісты і гаспадарчая партыя. Сьпіс „ультра-левае" групы Ковша за які галасавалі таксама аналь усе прыхільнікі Урбанса (другое „ультра-левае" групоўкі) атрымаў усяго 741 голас і не атрымаў ніводнага мандату.

У выніку ўчарайшых выбараў сацыял-дэмакраты (67 мандатаў) і камуністы—(20 мандатаў), ізноў маюць большасьць (87 мандатаў)—проці 73-х мандатаў буржуазных партый. Поўны правал ультра-левых ацэньваецца, як новы доказ нікчэмнасьці іх уплыву (ультра-левыя да сучасных выбараў заявралі, што на выбарах у кастрычніку 1927 г. яны ня ўдзельнічалі толькі таму, што ім не хапіла ўсяго некалькі сот подпісаў да 3 тысяч, якія тады вымагаліся, як умова для ўдзелу ў выбарах самастойным сьпісам).

У камуністычных колах ацэньваюць вынікі выбараў як спрыяючую адзнаку для выбарчае кампаніі кампартыі на надыходзячых выбарах у рэйхстаг, і як доказ няўхільнага росту ўплыву кампартыі на рабочыя масы.

Новыя тактычныя задачы ангельскае кампартыі.

Пленум выканкому Камінтэрну даручае кампартыі высунуць больш выразную праграму барацьбы проці лідэраў рабочае партыі і рэфармісцкіх прафсаюзаў. —У перавыбарчую кампанію кампартыя павінна выступіць у якасьці выразна незалежнае палітычнае партыі.

ПРАЦА АНГЕЛЬСКАЕ КАМІСІІ ПЛЕНУМУ.

ЗАЯВА КЕМПБЭЛА.

(Англія).

Тав. Кемпбэл па даручэньні ангельскае камісіі падае пленуму адназгодна ўхваленую камісіяй рэзалюцыю з выводамі, да якіх прышла камісія ў выніку абмеркаваньня становішча ў Вялікабрытаніі. Прамоўца пераказвае і тлумачыць асноўныя палажэньні рэзалюцыі, якая асьвятляе тактыку ангельскае кампартыі.

Мы лічым,—кажа Кемпбэл—што падзеная намі рэзалюцыя зьяўляецца моцным падмуркам для пасьпешнае працы, што мы здолеем на падставе яе ўзмацніць брытанскую кампартыю, як зброю вызваленьня пралетарыяту, і што палітыка, якая з такою энэргіяй і сілай была выкавана на гэтым пленуме, дасьць магчымасьць брытанскай кампартыі і брытанскаму пралетарыяту рашуча выступіць на шлях перамогі над усімі сваімі ворагамі.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ Т. АРНОТА.

(Англія).

Тав. Арнот заяўляе: сучасны момант спрыяе, каб камуністычная партыя выступіла адкрыта, кінула выклік кіруючым органам рабочае партыі і ўзяла на сябе кіраўніцтва пралетарыятам, навагу якога яна ўжо заваявала сваёю барацьбою ў абарону гарнякоў у 1926 г. Камуністычная партыя кіне таксама выклік і лідэрам рабочае партыі ў іх уласных выбарчых округах. Яна выставіць проці іх сваіх камуністычных кандыдатаў. Камуністычная партыя, абіраючы новы шлях барацьбы, не адмаўляецца пры гэтым і ад тактыкі адзінага фронту. Яна праз увесь час будзе камбінаваць сваю тактыку адзінага фронту з самым выразным і незалежным кіраўніцтвам барацьбою пралетарыяту.

ПРАМОВА Т. ЭРКОЛІ.

(Італія).

Тав. Эркулі зазначае, што праца ангельскае камісіі пленуму мае вельмі важнае значэньне для жыцьця Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Вынікі гэтае працы займуць першараднае месца ў гісторыі камуністычнага руху нашае эпохі. Ангельская кампартыя павінна згуртаваць усе свае сілы на ажыцьцяўленьні такое задачы: **вырваць масы з пад уплывы рабочае партыі**, каб павесьці гэтыя масы за сабою і стаць партыяй мас, уступіўшы на рэвалюцыйны шлях. Выпрацоўка новага напрамку ангельскае кампартыі была вынікам шчыльнага супрацоўніцтва між цэнтрам ангельскае партыі і кіруючым цэнтрам Камуністычнага Інтэрнацыяналу. У выніку працы пленуму ЦК ангельскае партыі шчыльна згуртаваўся на аснове напрамку Камінтэрну.

ПРАМОВА Т. ЛАРКІНА.

(Ірляндыя).

Тав. Ларкін лічыць правільным напрамак, намечаны камісіяй. Сапраўды ленінізм,—кажа ён—складаецца з таго, каб зьменьваць сваю тактыку ў адпаведнасьці з узьнікшымі перашкодамі і зьмененымі варункамі. Я думаю, што калі-б тав. Ленін быў сёньня з намі тут на пленуме, дык ён адобрыў-бы гэты напрамак і падтрымаў-бы нашыя пастановы.

Нашы таварышы ў Вялікабрытаніі пры падтрыманьні Камінтэрну ўзмоцняць свой наступ і, абапіраючыся на ўсе сэкцыі Камінтэрну, павядуць сваю партыю і рабочую клясу Вялікабрытаніі да сацыяльнае рэвалюцыі.

ПРАМОВА Т. БРАЎНА.

(Англія).

Тав. Браўн гаворыць: аднагодная пастанова, дасягнутая пры абмеркаваньні ангельскага пытаньня, даказвае, што мы маем справу з партыяй, якая дасягла вельмі высокага ўзроўню ў камуністычнай палітыцы. У шмат якіх сэкцыях Камінтэрну нават ня столькі вялікія палітычныя рознагалосьсі маглі-б стаць асноваю для фракцыйнае барацьбы. Аднак, тут мы дасягні згоды, якая, на нашую думку, дасьць усяму Камінтэрну гарантыю ў тым, што ангельскія таварышы пасьля свайго прыезду ў Англію будуць праводзіць намечаную палітыку.

* * *

Тав. Галахер (Англія) выказвае ўпэўненасьць, што ЦК ангельскае кампартыі і ўся партыя належным чынам ацэняць падтрыманьне, якое было ім аказана Камінтэрнам у часе гэтага пленуму. Партыя прадэманструе сваю ўдзячнасьць тым, што самым лёйяльным і самым энэргічным чынам распачне ажыцьцяўляць тыя задачы, якія намечаны ў ухваленай камісіяй рэзалюцыі. Прамоўца просіць пленум адназгодна ўхваліць яе, як намячаючую важнейшыя задачы для кампартыі Вялікабрытаніі.

РЭЗАЛЮЦЫЯ ГАЛАСУЕЦЦА І ЎХВАЛЯЕЦЦА АДНАЗГОДНА.

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПА АНГЕЛЬСКІМ ПЫТАНЬНІ.

Ухвалена аднагодна.

У рэзалюцыі гаворыцца: ангельская буржуазея, пастаўленая за ўмовы абвостранае міжнароднае [illegible] і хранічнае дэпрэсіі ў асноўных прамысловасьці, няўхільна [illegible] весьці і далей палітыку павялічанага нажыму на рабочую клясу ўнутры краю і [illegible] прыгнечэньня калоній, прадушэньня вызваленчых нацыянальна-рэвалюцыйных рухаў, асабліва рухаў рабочых і сялян. У галіне замежнае палітыкі ангельская буржуазея будзе, як і раней, весьці падрыхтоўку да вайны проці СССР.

Супярэчаньне пралетарыята проці палітыкі кіруючых клясаў нямінуча абвострыць клясавую барацьбу Вялікабрытаніі. Ідэалёгічна рэфармісцкія правадары рабочае партыі і трэд'юніёнаў адкрыта прытрымліваюцца пункту гледжаньня актыўнага супрацоўніцтва з капіталістамі проці рэвалюцыйнага пралетарыяту. Арганізацыйна яны імкнуцца абярнуць фармальна незалежныя арганізацыі рабочых у падсобныя апараты буржуазеі шляхам супрацоўніцтва іх верхавін з буржуазнымі арганізацыямі. Гэтая кансалідацыя капіталістычнае буржуазеі і рэфармізму праводзіцца разам з разгортваньнем барацьбы між правым крылом і рэвалюцыйнымі рабочымі, якая абяртаецца ў атаку правадыроў рабочае партыі і прафсаюзаў на левыя элемэнты рабочага руху і, у першую чаргу, на кампартыю, адзіную рэвалюцыйную партыю пралетарыяту.

З другога боку, нават аб'ектыўныя абставіны павялічваюць нездаволеньне ў асяродку шырокіх мас рабочае клясы ня толькі агульным становішчам у краі, але і рэфармісцкай палітыкай афіцыйных кіраўнікоў рабочае партыі і трэд'юніёнаў.

У гэткіх умовах перад кампартыяй высоўваецца неабходнасьць, абапіраючыся на [illegible] палажэньне мас, **выступаць з усё больш выразнай і вострай тактыкай барацьбы проці рабочае партыі і лідэраў прафсаюзаў**, каб узьняць актыўнасьць левых рабочых у барацьбе з бюракратыяй, **дзеля завабны кіраўніцтва рабочаю клясаю ў барацьбе з капіталізмам.** У сучасны момант яшчэ не магчымагодна здымаць лёзунг уваходу ў рабочую партыю, бо яна па сваёй арганізацыйнай структуры яшчэ не абярнулася канчаткова і поўнасьцю ў сацыял-дэмакратычную партыю.

Разам з тым, барацьба за ўваход у рабочую партыю павінна быць абернута ў наступальную барацьбу проці ж здрадніцкага кіраўніцтва. Будаваць усю тактыку на барацьбе толькі проці аднаго (кансэрватыўнага) лягеру няправільна; барацьба павінна весьціся проці абодвых лягераў розными мэтадамі. Цяпер т. зв. рабочы ўрад з самага пачатку будзе выразнаю зброяю наступу на рабочых. Гэта высоўвае перад кампартыяй неабходнасьць **выразней і вострай выступаць у якасьці незалежнае палітычнае партыі**, зьмяніць сваю пазіцыю ў адносінах да рабочае партыі і „рабочага ўраду" і, значыць, **замяніць лёзунг рабочага ўраду лёзунгам рэвалюцыйнага рабочага ўраду.** Партыя, як і раней, выступіць на выбарах, як самастойная арганізацыя з сваёй платформай, лёзунгамі і г. д.

Кампартыя будзе імкнуцца да [illegible]соўваньня максымальнага ліку самастойных камуністычных кандыдатур. Адначасна неабходна ўзмацніць кампанію за склік сэкцыямі і арганізацыямі рабочае партыі новых перадвыбарчых канфэрэнцый на аснове роўнапраўнага ўдзелу камуністаў і прыхільнікаў руху левага крыла. Калі, не зважаючы на жаданьне рабочых, апарат рабочае партыі адмовіцца склікаць гэткія канфэрэнцыі, ці не дазволіць камуністам і левым рабочым брацьдзел у іх, дык партыя павінна супольна з левымі рабочымі склікаць неафіцыйныя перадвыбарчыя канфэрэнцыі.

Абсалютна неабходна высоўваць кандыдатаў у процівагу лідэрам рабочае партыі і генэральнае рады. Паколькі значныя гушчы рабочых мас яшчэ ідуць за рэфармісцкімі правадырамі, дык абсалютна неабходна прапанаваць адзіны фронт як у нацыянальным, так і ў масцовым абхваце, каб яшчэ лішні раз выкрыць лідэраў рабочае партыі і прафсаюзаў, якія аддаюць перавагу адзінству з капіталістамі перад адзінствам з рэвалюцыйнымі рабочымі.

З прычыны важнага значэньня зрушэньняў, якія адбыліся ў Вялікабрытаніі, дзеля арганізаванага ажыцьцяўленьня новае тактыкі, ЦК КП Вялікабрытаніі навінен правесьці шырокую дыскусію па ўсіх праблемах і пытаньнях, зьвязаных з гэтаю тактыкаю.

За дзень.

Новы прыхільнік СССР.

У ліку амэрыканскіх прыхільнікаў прызнаньня СССР поруч з сэнатарам Бора, які ўжо некалькі гадоў вядзе кампанію ў гэтым напрамку, зараз зьявіўся кароль амэрыканскай аўтамабільнай прамысловасьці вядомы ўсяму сьвету Гэнры Форд.

Чаго ці для гэтага факту можна знайсьці лепшае тлумачэньне, чым тыя некалькі лічбаў, якія датыкаюцца агульнага становішча амэрыканскай народнай гаспадаркі наогул і ў прыватнасьці становішча тэй галіны прамысловасьці, на чале якой стаіць Форд.

Амэрыканскі эканамічны штотыднёвік „Аналіст" малюе „гаспадарчую актыўнасьць" Амэрыкі ў канцы 1927 году і паказвае рэзкі скок уніз усяго тэмпу разьвіцьця амэрыканскай гаспадаркі за мінулы пэрыяд. Бяручы за нармальны ход разьвіцьця гаспадаркі лічбу 100, „Аналіст" паказвае, што амэрыканская гаспадарка за гэты тэрмін зьнізілася па ўзроўвень 90,7.

Паказваючы асобна разьвіцьцё аўтамабільнай прамысловасьці, мы бачым, што яе вытворчасьць у працягу гэтага часу спусьцілася яшчэ ніжэй і дасягнула лічбы 60, што зусім зразумела азначае ўжо не дэпрэсію, а сапраўдны крызіс гэтай галіны прамысловасьці. Як зьвернемся да заводаў Форда, дык убачым, што крызіс, галоўным чынам, і датычыцца яго, бо скарачэньне аўтамабільнай вытворчасьці ў 1927 г. адбывалася, галоўным чынам, на яго заводах. У мінулым годзе Форд выпусьціў усяго 394256 легкавых машын замест 1080918 у мінулым годзе, што азначае скарачэньне на 64 проц.

Фінансавая магутнасьць Форда дазволіла яму не напаўняць свае склады далейшай вытворчасьцю машын, на якія няма попыту, а пераабсталяваць заводы і прыстасаваць іх да вытворчасьці новай мадэлі машын. З гэтай новай мадэллю сёлета выходзіць на рынак Форд, але яму прыдзецца трымаць сур'ёзную канкуранцыю з боку іншых вытворцаў аўтамабіляў, якія таксама пачалі ўжываць новыя мадэлі.

„Выбары" ў Зах. Беларусі.

На мачоры ніякай магчымасьці пераканаць сялянска-рабочыя масы Зах. Беларусі ў тым, што трэба ісьці за сучасным польскім урадам, польская санацыя выбрала самы просты спосаб ліквідацыі непажаданых ёй выбарчых сьпіскаў—поўнае іх скасаваньне.

Тэлеграф прынёс ужо некаторыя данныя аб „працы" розных акруговых кампаній, якія разглядалі выбарчыя сьпіскі. Пасьля гэтага „разгляду" ад радыкальных беларускіх сьпіскаў мала што засталося.

Так, напрыклад, у Сьвянцяскай акрузе з 19 зложаных сьпіскаў скасавана 12. Зацьверджаны толькі сьпіскі пілсудчыкаў, эндэкаў і буржуазнага блёку нацменшасьцяў. У Новагрудку выб. камісія зацьвердзіла сьпісак беларускага сялянска-работніцкага аб'яднаньня, але выкрэсьліла з яго прозьвішча Тарашкевіча, Мятлы, Бурсевіча, Ходзькі і Кузьміча, арыштаваных у сувязі з працэсам „Грамады". У Беластоку бел. рабоча-сялянскі сьпісак уняважнен. У Вільні ўняважнен, апрача сьпіску рабоча-сялянскай еднасьці, сьпісак Польскай Сялянскай Партыі і партыі дробных земляробаў б. пасла Гэльмана.

Адным словам, рэпрэсіі сыплюцца, як і трэба было гэтага чакаць, бо іншых сродкаў санацыя ня мае.

Санацыйная „Эпока" заявіла нават асобныя аддзелы аб рэпрэсіях, зьвязаных з выбарамі. У самым аддзеле пад загалоўкам: „Новыя арышты кандыдатаў у дэпутаты" газэта друкуе сэнсацыйныя весткі аб арыштах варожых санацыі б. паслоў сойму, а ў другім—пад загалоўкам: „Масавае анулірваньне выбарчых сьпісках" з задаволеньнем пералічае анулірваныя выбарчымі камісіямі сьпіскі, сярод якіх амаль ня выключна знаходзяцца сьпіскі беларускія, украінскія і наогул апазіцыйныя сьпіскі. Пры гэтым газэта цынічна дадае, што фармальная прычына скасаваньня сьпіску „заўсёды знойдзецца, калі яе папукаць".

Ну, а пры такім благаславеньні начальніцкага вока сумняваецца ў стараньнях мясцовай адміністрацыі на прыходзіцца. Яна робіць „выбары" з паданых сьпіскаў так, што застаецца толькі пажаданыя ўраду сьпіскі.

Перадвыбарчы тэрор Пілсудчыны.

ВАРШАВА, 18-II. Шукаючы дэпутата нацыянальнае сялянскае партыі Ваявудзкага, віленская паліцыя ўчыніла памылкова вобыск у намесьніка старшыні віленскага акруговага суду. Віленскія газэты, зьмясьціўшыя аб гэтым паведамленьне, канфіскаваны.

Абставіны забойства ўпаўнаважанага блёку рабоча-сялянскага адзінства ў Вільні да гэтае пары ня выкрыты.

Належыць, аднак, адзначыць, што труп Шварцблёйса быў знойдзен у райёне фортаў, куды прыватным асобам бяз пропуску ўваход забаронены. Водлуг паведамленьняў ляўрэйскіх газэт, Шварцблёйс загадзя да забойства атрымаў некалькі пагражаючых лістоў. Дакументы і грошы знойдзены пры забітым, з прычыны чаго забойства з мэтаю рабунку выключаецца.

СТРЭЛЫ НА МІТЫНГУ БЛЁКУ НАЦМЕНШАСЬЦЯЎ.

На адным з мітынгаў блёку нацменшасьцяў у Варшаве раптам раздалося тры стрэлы з рэвальвэру, пасьля пачалася страшэнная паніка. Конная і пешая паліцыя зачыніла мітынг.

РАЗГОН КАМУНІСТЫЧНАГА МІТЫНГУ.

Паліцыя разагнала ў Варшаве камуністычны мітынг. Сабраныя на мітынгу рабочыя вышлі з маніфэстацыяй на вуліцу. Конная і пешая паліцыя накінулася на маніфэстантаў і разагнала іх. 6 маніфэстантаў паранена шаблямі ў галовы.

БЕЛСЕЛЬСАЮЗЬНІКА АБВІНАВАЧВАЮЦЬ У КАМУНІЗЬМЕ (!?).

Гэтымі днямі палітычная паліцыя арыштавала ў г. Браславе віцэ-старшыню „Бел. сялянскага саюзу" Юхневіча па абвінавачаньні ў камуністычнай прапагандзе. Юхневіч стаіць першым кандыдатам па сьпіску „блёку нацменшасьцяў" у Браслаўскай акрузе.

КАНФІСКАЦЫЯ „СІЛЫ ПРАЦЫ".

Урадавы камісар г. Вільні сканфіскаваў № 7 радыкальнай бел. газэты „Сіла Працы" за артыкул: 49-ая сэсія рады Лігі Нацый".

СКАРГА НА СКАСАВАНЬНЕ СЬПІСКУ НАЦМЕНШАСЬЦЯЎ.

Прадстаўнік скасаванага ў Ковелі сьпіску нацменшасьцяў падаў старшыні выб. камісіі скаргу, што скасаваньне наступіла нефармальна, насупроць пастановам „выбарчай ардынацыі".

СКАСАВАНЬНЕ УКРАІНСКІХ СЬПІСКАЎ.

„Роботнік" паведамляе, што ў шэрагу округаў Галіцыі і наогул Зах. Украіны акруговыя выбарчыя камісіі скасавалі сьпіскі Блёку Нацменшасьцяў і „Сельробу". Дзякуючы гэтаму, нацменшасьцёвыя групы, а пераважна украінцы пазбаўлены магчымасьці вывіць сваю палітычную акцыю на выбарах.

ЯЎРЭЙСКІЯ ВЫБ. СЬПІСКІ ВІЛЬНІ.

У Вільні зацьверджаны наступныя яўрэйскія выб. сьпіскі: № 18 (Блёк Нацменшасьцяў), № 33 (Кіршбраун—Прылуцкі), № 4 (Бунд) і № 5 (Паолей-Сыён-лявіца).

РАЗЛОМ У „ПАРТЫІ БЕЛАРУСКІХ СЯЛЯН І РАБОТНІКАЎ.

„Дзеньнік Віл." (№ 40) паведамляе, што ў памянёнай партыі (Я. Станкевіча) адбываецца разлом. З партыі выступілі ўплывовыя асобы: д-р Дварчанін, Шэйн і Яцэвіч. Бліжэйшымі днямі належыць чакаць далейшага разлому.

ГАНДЛЁВЫ БАЛЯНС ПОЛЬШЧЫ ЗА СТУДЗЕНЬ.

Паводле статыстычных даных галоўнай стадыстычнай управы, гандлёвы балянс Польшчы за студзень г. г. прадстаўляецца так: прывезена агулам 354.350 тонаў, каштоўнасьцю ў 271.166 тыс. злотых. З прычыны павялічэньня вывазу і зьменшэньня прывозу, перавышэньне прывозу над вывазам зьменшылася да 52.729.000 злотых.

Гуандунь пад уладаю рэвалюцыйных войск.

ШМАТ ГАРАДОЎ ПРАВІНЦЫІ Ў РУКАХ КАМУНІСТЫЧНЫХ АТРАДАЎ.

ШАНХАЙ, 20-II. З Кантону паведамляюць, што рэвалюцыйныя атрады на чале з камуністам Пан-Пай наступаюць на Гуйлай і Пуніін (на захадзё правінцыі Гуандунь). Атрады Пан-Пая захапілі Гуэтан) 50 кілёмэтраў на паўднёвы захад ад Пуніна).

Другая група рэвалюцыйнага войска на чале з камуністам Сяо-Го-Енам увайшла ў паветы Гуандунь і Хуня'м і захапіла горад Фуншэн (70 кілёмэтраў на поўнач ад Пуніну).

„Чайна Таймс" паведамляе, што камуністычныя атрады зьняліся ў ваколіцах Чао-Чоу і Сватоу(на заходняй мяжы правінцыі Гуандунь). Да камуністаў далучаюцца сяляне. Рэвалюцыйны атрад, на чале з камуністам Ван-Каем, захапіў горад Ічан (на мяжы правінцыі Гуандунь і Хунань).

Даляр перамог.

ПАН'АМЭРЫКАНСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ВА ЎСІМ БЫЛА ПАСЛУШНА ГОЛАСУ ЮЗА.

НЬЮ-ЁРК, 18-II. Прэзыдэнт рэспублікі Аргентыны афіцыйна заявіў, што аргентынскі ўрад асуджвае старшыню аргентынскае дэлегацыі на пан'амэрыканскай канфэрэнцыі, які адмовіўся падпісаць згоду аб рэарганізацыі пан'амэрыканскага саюзу; адмова выклікана нібы тым, што ва ўступнай частцы згоды, наперакор яго патрабаваньні, ня зьмешчана дакларацыя проці абарончых мытных тарыфаў Злучаных Штатаў. Старшыня аргентынскае дэлегацыі склаў свае паўнамоцтвы.

Канфэрэнцыя пастанавіла склікаць у будучым годзе ў Вашынгтоне спэцыяльную канфэрэнцыю для разгляду праэкту згоды аб прымусовым арбітражы пры канфліктах між амэрыканскімі дзяржавамі. Згодна праэкту, канфлікты па шмат якіх пытаньнях выключаны з-за пашаны да прымусовага арбітражу; так, напрыклад, выключаны канфлікты, зьвязаныя з пытаньнем аб незалежнасьці данае дзяржавы, ці аб яе суверэнітэце і інш.

Гэтая пастанова разглядаецца, як перамога Юза (кіраўнік дэлегацыі Злучаных Штатаў), які пры дапамозе вяыразнага пацыфісцкага праэкту згоды аб арбітражы адцягнуў увагу канфэрэнцыі ад канкрэтнае прапановы ўхваліць дакларацыю проці ўмешваньня Злучаных Штатаў ва ўнутраныя справы іншых амэрыканскіх дзяржаў.

„НЕДАЛІКАТНАЕ" ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ПРАДСТАЎНІКА САЛЬВАДОРУ.

ПЬЮ-ЁРК, 20-2. З Гаванны паведамляюць, што па кангрэсе пан'амэрыканскага саюзу міністр замежных спраў Сальвадора Гвэрэро зьвярнуўся да дэлегатаў з заклікам „перайсьці ад слоў да справы" і падаў рэзалюцыю аб поўнай забароне ўмешваньня Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў. Выступленьне Гвэрэро было спаткана ў лёжах для публікі бурнымі воплескамі і сьвісткамі па адрасе амэрыканскае дэлегацыі. Амэрыканская дэлегацыя пастаяла, каб пасяджэньне было перарвана. Перапынак даў магчымасьць Юзу „сабраць сілы".

Пасьля аднаўленьня пасяджэньня распачаліся жвавыя спрэчкі. Кангрэс раскалоўся. Дэлегацыі Нікарагуа, Пэру, Бразіліі і Кастарыка, не зважаючы на свае нядоўгія дакларацыі проці ўмешваньня Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, адкрыта выступілі са Злучанымі Штатамі проці Гвэрэро. Юз абараняў права Злучаных Штатаў умешвацца ва ўнутраныя справы краёў Лацінскае Амэрыкі, заявяючы, што Злучаныя Штаты „заўсёды абаранялі незалежнасьць краёў Лацінскае Амэрыкі". Пасьля выступленьня іншых дэлегатаў, якія падтрымалі погляд Злучаных Штатаў, Гвэрэро забраў сваю рэзалюцыю назад.

Чарговы кангрэс пан'амэрыканскага саюзу ўхвалена склікаць у Мантэвідэо (Уругвай).

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

КАНФЛІКТ у СЯРЭДНЯ-НЯМЕЦКАЙ МЭТАЛЁВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ АБВАСТРАЕЦЦА.

БЭРЛІН, 21-II, Дэлегацкі сход рабочых мэталёўцаў Сярэдняй Нямеччыны аднагалосна без устрымаўшыхся адхіліў

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ПАСТУПЛЕНЬНЕ ПРАТЭРМІНОВАК ПА С.-ГАСП. КРЭДЫТНАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Бабруйск, 20-II. Па вестках на 1 [illegible] па сыстэме сельска-гаспадарчай каапэрацыі лічылася пратэрміновак па пазыках 201000 р., за студзень і 15 дзён [illegible] сыскана пратэрмінованых пазык 114.000 руб. і зараз ужо маецца пратэрміновак усяго 87.000 руб.

Магілеў 20-II. Калі па першае студзеня бягучага году пратэрміновыя пазыкі складаліся ў суме 271.000 руб., дык па апошніх даных засталася іх 187.000 руб. За час кампаніі сельска-гасп. крэдытная каапэрацыя сабрала 84.000 руб. пратэрміновак.

Мазыр 20-II. Сысканьне пратэрмінованых пазык па сыстэме с.-гасп. крэдытнай каапэрацыі па нашай акрузе праходзе пакуль што слаба,—за час кампаніі па 10-ае лютага сыскана ўсяго толькі 14.000 руб.

ЗА ГІБКІ САВЕЦКІ АПАРАТ.

(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

Бабруйск, 20 II. Акруговая камісія рабоча-сялянскай інспэкцыі праверыла савецкія і каапэрацыйныя установы гораду. Праверка мела на мэце выяўленьне акуратнасьці і своячасовасьці зьяўленьня служачых установаў на працу. Праверцы падпала 20 установаў гораду.

Выяўлена вельмі несвоячасовае зьяўленьне на працу працаўнікоў установаў, канат і адказных кіраўнікоў установаў. У некаторых установах к 9 гадзінам, к часу, калі, звычайна, пачынаецца праца ва ўстановах, зьявілася толькі палова працаўнікоў.

Мелі месца спазьненьні працаўнікоў установаў на цэлую гадзіну.

У сучасны момант рабоча-сялянская інспэкцыя падводзіць вынікі праведзенай працы. Канчатковыя вынікі будуць падведзены на пасяджэньні камісіі Р.С.І. з удзелам прадстаўнікоў прафсаюзаў і эканомкамісіі. А. Д.

ДА 10-е ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

Гомель, 21-II. Падрыхтоўчая праца па правядзеньні 10 годзьдзя Чырвонай арміі скончана. Вялікая падрыхтоўчая праца праведзена ў вайсковых часьцях. Да дню гадавіны ў вайсковых часьцях будуць падведзены вынікі грамадзкіх арганізацый. Праводзіцца вялікі шэраг спаборніцтваў маладых байцоў па верхавой язьдзе, уладаньню халоднаю зброяю, раскладаньню і складаньню вінтовак і г. д.

Праводзіцца падрыхтоўка да фігурнай верхавой язды. Будуць праведзены масавыя вечары ў вайсковых часьцях, на прадпрыёмствах і ў школах. У дзень дзесяцігодзьдзя лепшыя байцы атрымаюць прэміі.

У Гомлі адчыняецца Дом Чырвонай Арміі.

САМААБКЛАДАНЬНЕ.

Гомель, 21-II. Ва ўсіх раёнах акругі арганізаваны камісіі для правядзеньня практычных мерапрыёмстваў на правядзеньню самаабкладаньня. Па вёсках праводзяцца растлумачальныя кампаніі аб самаабкладаньні. Беднякі выказваюцца за самаабкладаньне на ўпарадкаваньне вёсак.

АРГАНІЗАЦЫЯ НОВЫХ АРЦЕЛЯЎ.

Беларускі саматужна - прамысловы саюз зараз вядзе ўзмоцненую працу па арганізацыі ў мястэчках новых арцеляў. Шмат новых арцеляў (шавецкіх, кравецкіх, кавальскіх і інш.) ужо арганізаваны па мястэчках Менскай акругі.

ДОМ ДЛЯ ЧЫГУНАЧНІКАЎ.

Койданава, 20-II. У Койданаве пачалася пабудова новага вялікага будынку для месцовых чыгуначнікаў. Гэты будынак будзе закончан да восені.

АДНАЎЛЕНЬНЕ ЗГАРЭЎШАГА МЛЫНУ.

УЗДА, 21-II. Закончаны ўсе працы па аднаўленьні згарэўшага млыну ў м-ку Узда. Млын даабсталёван новай крупадзёркай.

У бліжэйшыя дні млын будзе пушчан у ход.

МІЛІЦЫЯНЭР-РАСТРАТЧЫК.

Гомель, 21-II. Памоцнік начальніка міліцыі Уваравіцкага раёну т. Паўлушэнка растраціў 1600 руб. дзяржаўных сродкаў. Справа аб растраце перададзена сьледчым органам для прыцягненьня вінаватага да адказнасьці.

Больш увагі самаабкладаньню.

У НЕКАТОРЫХ СЕЛЬСАВЕТАХ ЯШЧЭ НЕ ПАЧЫНАЛАСЯ ПРАКТЫЧНАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ САМААБКЛАДАНЬНЯ. ТРЭБА ЛЕПШ РАСТЛУМАЧЫЦЬ ЗАКОН. БОЛЬШ ГРАМАДЗКАЙ ДУМКІ ВАКОЛ ПЫТАНЬНЯ САМААБКЛАДАНЬНЯ.

Гэтымі днямі мне здарылася быць у Магілеўшчыне і мець магчымасьць пагутарыць з сялянамі адносна самаабкладаньня.

Маё агульнае ўражаньне такое, што закон аб самаабкладаньні ў некаторых сельскіх саветах (Шклоўскі р.) амаль зусім не праводзіцца ў жыцьцё. Чаму?

Таму, што мясцовыя органы ўлады не правялі дастатковае ініцыятывы і не далі практычных указаньняў на гэтым пытаньні. Тут прыходзіцца зрабіць вывад, што да выпаўненьня закону аб самаабкладаньні наглядаюцца нядбайныя адносіны.

У Чарнарэцкім сельсавеце Шклоўскага раёну мне сказалі:

— Чулі, што выдаўся закон аб самаабкладаньні насельніцтва, але з РВК да гэтага часу ня было ніякіх указаньняў. Што рабіць і як рабіць?

Такі адказ можна пачуць і ў іншых сельсаветах. Як відаць, некаторыя сельсаветы ня толькі не пачыналі працы па самаабкладаньні, але нават не зрабілі сярод насельніцтва растлумачэньня закону і не стварылі вакол гэтага пытаньня грамадзкай думкі. Трэба правесьці тлумачэньне, каб сялянства ведала сутнасьць і мэты самаабкладаньня, бо калі селянін (хоцьбы бядняк, і серадняк) будзе ведаць сутнасьць закону, то ён ня пойдзе пад уплыў кулакоў, якія жадаюць перашкодзіць справе самаабкладаньня.

Гэта першае, а падругое—нам трэба настолькі правяліць ініцыятыву, каб сялянства звыш закону дабраахвотна самаабкладалася. Першым прыкладам у гэтай справе павінны зьявіцца камсамольцы і наогул усе актывісты. Вакол закону аб самаабкладаньні трэба згуртаваць грамадзкую думку, бо гэты **закон мае вялікае значэньне для эканамічнага і культурнага разьвіцьця нашай вёскі;** гэты закон даў поўную магчымасьць сялянству **прымаць удзел у сацыялістычным будаўніцтве вёскі.**

Чакаць няма чаго. Трэба зараз-жа прыступіць да практычнага правядзеньня закону аб самаабкладаньні; трэба загадзя зрабіць прыблізны разьлік грошай (ці працоўнай сілы) і куды іх у першую чаргу неабходна пусьціць.

А калі РВК і сельсаветы будуць сядзець склаўшы рукі і нічога не рабіць, то яны могуць сарваць справу самаабкладаньня, робячы ўсё насьпех, не выяўляючы першых патраб вёскі.

Больш увагі самаабкладаньню—аднаму з важных мерапрыёмстваў па ўздыму дабрабыту вёскі.

З. Таганскі.

Аб вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі

(Рэзалюцыя Пленуму ЦК КПБ, прынята 18 лютага аднагалосна).

I. На падставе дырэктыў XV Зьезду УсеКП(б) і XI Зьезду КП(б)Б у галіне мерапрыёмств па сельскай гаспадарцы неабходна сёлетнюю вясеньнюю сельска-гаспадарчую кампанію праводзіць у напрамку дарчую кампанію пашырэньня арганізацыі калектыўнага земляробства, адчуваньня розных прадпрыёмстваў па перапрацоўцы сельска-гаспадарчых прадуктаў, пашырэньню розных выробчых відаў сельска-гаспадарчай каапэрацыі, поўнага і больш эфэктыўнага скарыстоўваньня капітальных укладаньняў у сельскую гаспадарку; далейшаму пашырэньню гаспадарчай дапамогі вясковай бедноце, а таксама і серадняцкаму сялянству.

II. Дзеля практычнага ажыцьцяўленьня памянёных дырэктыў, Пленум ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1) У пасеўную кампанію паставіць, як задачу, пашырэньне ўсёй пасеўнай плошчы ў сярэднім на 2 проц., тэхнічных культур (лён, каналі) на 10,5 проц., бульбы—на 7 проц., пашырыць пасеў кармавых траў і пасевы, асабліва ў раёнах малочнай правесьці, асабліва ў кармавых коранаплодаў на плошчы ня менш 20.000 гэкт.

2) Пры правядзеньні інтэнсыфікацыі ў сельскай гаспадарцы, што будзе адбівацца на скарачэньні плошчы зернавых культур, неабходна правесьці шэраг практычных мерапрыёмстваў з тым, каб балянс вбожжавых культур павялічваўся за кошт пашырэньня ўраджайнасьці, разам з гэтым дабівацца пашырэньня ўраджайнасьці і ўсіх іншых культур (ільну, бульбы, траў).

3) Прыняць да ведама, што Наркамзэмам дзеля спабжэньня сельскай гаспадаркі сродкамі вытворчасьці праводзіцца праз Белсельсаюз і Цэнтраземскład у плянавым парадку дастаўка на вёску гэтых сродкаў на суму 10.890.000 руб., што дае павялічэньне супроць мінулага году на 19 проц., у тым ліку насеньня (акрамя аўсу і ячменю) на 1.400 тыс. руб. (павялічэньне супроць мінулага года на 55 проц.), штучнага ўгнаеньня на 990 тыс. руб. (павялічэньне супроць мінулага года на 97 проц.) і сельска-гаспадарчых машыны на 4.380 тыс. руб. (павялічэньне на 23 проц.).

4) З боку цэнтральных апаратаў, якія вядуць падрыхтоўку да вясеньняй пасеўнай кампаніі, неабходна адзначыць слабую загатоўку вычайнага аўсу, ячменю, лубіну, вікі, калійнай солі і тамасшлаку. Белсельсаюзу і Цэнтраземскладу прыняць энэргічныя меры па загатоўцы вікі, лубіну, сэрадэлі па мясцовым рынку; візавым зямельным установам, камітэтам узаемадапамогі, каапэрацыі—распачаць больш энэргічную працу па загатоўцы неабходнага насеннага матар'ялу.

Разам з гэтым дабівацца перад урадам СССР аб завозе ў БССР аўсу і ячменю, і аб дазволе імпартаваць з замеж тамасшлак і калійную соль.

5) Падрыхтоўка да вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі на мясцох праходзіць слаба—недастаткова разгорнута праца па вычыстцы і пратраўліваньню насеньня, недастаткова праводзіцца каапэраваньне сялянства. Пленум ЦК КПБ даручае:

Акругкомам, райкомам і сельчэйкам праз групы беднаты, сельска-гаспадарчыя сэкцыі сельсаветаў, сельска-гаспадарчыя гурткі, камітэты ўзаемадапамогі і візавую каапэрацыю на мясцох прапрацаваць практычныя і канкрэтныя мерапрыёмствы па правядзеньню вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі ў вёсцы, сельсавеце, раёне і вызначыць, колькі ў раёне, сельсавеце магчыма на працягу кампаніі арганізаваць а) калхозаў, машынных, мэліярацыйных, садова-гародных, малочна-жывёлаводных, насеннаводных і іншых таварыстваў, разам з гэтым канкрэтна вызначыць і пабудаваць у некаторых з таварыстваў неабходныя там тэхнічныя прадпрыёмствы, прыцягваючы да гэтай справы крэдыт і сродкі самога сялянства;

б) на кожнаму раёну і сельсавету вызначыць, колькі і якіх калхозаў, насёлкаў будзе пераведзена на шматпольле, колькі будзе закладзена паказальных вучасткаў і свабодных практычных працаў магчымы спэцыялістым поўнасьцю правесьці гэтыя мерапрыёмствы, перасоўваючы туды крэдыт і неабходныя сродкі вытворчасьці.

У зьвязку з выпускам увосень з дзяржаўных выхавальнікаў плодовых саджанцаў правесьці ўвосень з вырокім прыцягненьнем спэцыялістых у калхозах, насёлках падрыхтоўчую працу па закладзе грамадзкіх садоў, зьвязваючы гэтую справу з арганізацыяй таварнага гародніцтва, а таксама правесьці ў прыгародных раёнах і мястэчках арганізацыю садова-гародных калектыўных аб'яднаньняў;

в) разгарнуць працу па зернаачыстцы так, каб было ачышчана насеньне ня менш 25 проц. па рэспубліцы;

г) правесьці падбор слухачоў на аграномічныя курсы, асабліва доўгатэрміновыя, якія будуць падрыхтоўваць упаўнаважаных насёлкаў, прадстаўнікоў колхозаў, сельска-гаспадарчых гурткоў і інш.

6) НКЗ і Белсельсаюзу ў сёлетнюю с. г. кампанію праз візавыя установы прыняць меры да ўзмацненьня існуючай сеткі савгасаў і калгасаў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на рацыянальную арганізацыю гаспадарак, асабліва там, дзе савгасам і калгасам перададзены розныя прадпрыёмствы, і вызначыць на гэтую мэту неабходныя крэдытныя сродкі.

7) Каб пазбавіць вясковую беднату ад эксплёатацыі кулацтва праз сельска гаспадарчыя машыны і прылады—даручыць НКЗ, Белсельбанку, Белсельсаюзу і камітэтам узаемадапамогі ў сёлетнюю сельска-гаспадарчую кампанію пашырыць сетку пракатных пунктаў (асабліва па лініі савгасаў і калгасаў) і арганізацыю машынных тав-ваў.

8) Каб пашырыць тэмп калектывізацыі сельскай гаспадаркі і больш забясьпечыць вязмельныя інтарэсы беднаты і серадняку, неабходна прыняць больш энэргічныя меры па арганізацыі на землях працоўнага карыстаньня калектыўнага земляробства, дзеля чаго пашырыць на гэту мэту крэдыт, практычна праводзіць выдзел меншасьці з вязмельнага вобчества, пры ўмовах, што яно пераходзіць да калектыўнай апрацоўкі зямлі, практычна распрацаваць пытаньні аб некаторым пашырэньні норм дзеля тых гаспадарак, якія будуць пераходзіць да калектывізацыі і праэкт норм прадставіць на зацьвярджэньне СНК.

9) Зьвярнуць увагу мясцовых установ і арганізацый на падбор бяднацка-серадняцкага сялянства, камсамольцаў і партыйцаў у склад правядзячых курсаў на падрыхтоўцы працаўнікоў калектыўных гаспадарак, пры чым, пры падрыхтоўцы палажыць такі прынцып, каб курсы падрыхтоўвалі працаўнікоў для работ толькі непасрэдна ў гаспадарках (калгасы, савгасы, насёлкі і г.д.). Увесьці ў с.-г. акадэмії, а таксама ў сельска-гаспадарчых тэхнікумах спэцыяльны курс буйнага сацыялістычнага земляробства.

10). Пры падрыхтоўцы спраў па зямляўпарадкаваньню сёлетняга году правесьці спэцыяльную кампанію за пераход бяднацка-серадняцкага сялянства да калектыўнай формы землякарыстаньня. Усім вязмельным, каапэрацыйным і крэдытным установам уключыць у план спэцыяльнага абслугоўваньня ўноў арганізуемыя калектыўныя гаспадаркі.

11) Вопыт па арганізацыі насёлкаў паказаў, што гэтая форма вызначаецца жыцьцёвай і дае рэальную магчымасьць сялянству правядзіць інтэнсыфікацыю сваіх гаспадарак, садзейнічаючы вырокаму каапэраваньню сялянскіх гаспадарак. Таму і ў далейшым неабходна правядзіць курс на насёлкі, пры гэтым неабходна правесьці вопыт пераводу некаторых асобных насёлкаў на спрошчаны каапэрацыйны статут (арганізацыя „насёлкавых вытворчых каапэратываў"), дзе арганізоўваць насёлкавыя грамадзкія сады, шматпалёвыя севазвароты і наогул праводзіць больш шырокае каапэраваньне насёлкавай сельскай гаспадаркі.

12) Землеўпарадкаваньне, якое вызначана, правесьці ў сёлетнім годзе на плошчы 640.000 гэкт. (што ахопіць каля 58.400 дваёў), зьвяўляецца працы на землеўпарадкаваньню і па арганізацыі шматпольля ў раёнах з вызначаным рыначным напрамкам гаспадарак, ці са здавальняючымі рынкавымі ўмовамі для вядзеньня сельскае гаспадаркі, асабліва ў раёнах рыначнага ільнаводства і малочнай гаспадаркі, накіроўваючы гэтыя мерапрыёмствы на палепшаньне бяднацка-серадняцкіх гаспадарак;

в) каб забясьпечыць належнае разгортваньне працы па арганізацыі шматпольля, асабліва з боку яканасьці выкананьня працы—увесьці сыстэму прэміраваньня расобных аграномаў і даручыць СНК пры разглядзе пляну мерапрыёмств па сельскай гаспадарцы абгаварыць пытаньне на ўзгадзеньню прэміраваньня аграномаў за асобна выразныя посьпехі ў працы па калектывізацыі і пераводу на шматпольле.

22) Для далейшае рэарганізацыі сельскае гаспадаркі неабходна шырокая і сталая агранамізацыя самога сялянства, для чаго неабходна на ўсіх раёнах рэспублікі арганізаваць зімовыя сельска-гаспадарчыя школы для сялянства.

23) Дзеля неабходнага практычнага вырашэньня кармавога пытаньня неабходна больш пашырыць палявы травасеў, правесьці за кошт дзяржавы закладку шэрагу паказальных вучасткаў у бяднацка-серадняцкіх гаспадарках кармавых карняплодаў, разам з гэтым на ўсіх раёнах правесьці і ўжо ў бягучым годзе заложыць у калектывах, насёлках, штучных насьцьбінах, а таксама пачаць працу па палепшаньню натуральных сенажаняў і выганаў.

24) У зьвязку з прынятай пастановай ураду аб выстаўцы і конкурсе, неабходна разгарнуць актыўнасьць бяднацка-серадняцкага сялянства каля задач падрыхтоўкі да першае ўсебеларускае выстаўкі сельскае гаспадаркі і прамысловасьці, а таксама ўсебеларускага конкурсу на лепшы сельска-гаспадарчы райён. Правесьці падрыхтоўку сельска-гаспадарчай выстаўкі і конкурсу пад лёзунгам калектывізацыі, кожны калектыў, каапэратаў, насёлак і асобныя гаспадаркі за гэты час палепшылі сваю гаспадарку праз пераход на шматпольле, дасягнулі больш высокіх ураджаяў, разьвядзеньня племяннае жывёлы і ўсебакавага каапэраваньня.

25) Каб пашырыць разьвіцьцё аграмаджанай сельскай гаспадаркі, неабходна прыстасаваць увесь апарат Наркамзэмаў земляробства БССР да выкананьня вызначаных задач, пры чым, прымаючы над увагу ў асобных выпадках слабасьць райённага зямельнага і каапэрацыйнага апарату,—зьвярнуць увагу ўсіх партыйных арганізацый на неабходнасьць узмацненьня райённых зямельных установ больш здольнымі працаўнікамі, якія маюць справіцца з пастаўленымі ў сельскай гаспадарцы задачамі.

Правесьці практычную працу па навучэньню на кіруючую зямельную і каапэрацыйную работу актыву з бядняцка-серадняцкіх колаў.

26) Роля спэцыялістых сельскае гаспадаркі (аграномаў, каморнікаў, мэліяратараў, ветурачоў і інш.) зьяўляецца надзвычайна важнай у арганізацыі сацыялістычнага земляробства, таму ўсім партыйным і савецкім установам прыняць усе неабходныя меры да ўтварэньня спрыяючых умоў у іх працы і разгрузіць спэцыялістых ад усякае працы не зьвязанай са спэцыяльнасьцю і грамадзкай дзейнасьцю.

Мясцовым партыйным і савецкім установам садзейнічаць спэцыялістым у іх практычнай працы, па ажыцьцяўленьню мерапрыёмстваў, па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і мабілізаваць бяднацка-серадняцкую актыўнасьць у гэтай працы.

27) Выходзячы з таго, што вясновая сельская гаспадарчая кампанія зьяўляецца адным з важнейшых вучасткаў работы на вёсцы ўсіх партыйных, савецкіх і каапэрацыйных установ і арганізацый і што ўсе вызначаныя вышэй мерапрыёмствы могуць бысь ажыцьцёўлены пры максімальнай актыўнасьці шырокіх пластоў сялянства і асабліва вясковай беднаты, прапанаваць усім партыйным, камсамольскім, каапэрацыйным, палітасьветным установам і арганізацыям ва ўсёй масавай і прапагандысцкай працы на вёсцы зьвярнуць асаблівую ўвагу на згрупаваньне ўвагі і мабілізаваньне шырокай ініцыятывы і самадзейнасьці шырокіх пластоў сялянства пераканаць мерапрыёмствам па падрыхтоўцы і правядзеньню вясновай сельска-гасп. кампаніі.

28) Пленум даручае Бюро ЦК даць дырэктывы адзначаным савецкім органам па хутчэйшым выпаўненьню пытаньняў:

а) аб устанаўленьні прыняцьця кадзастраваньня на мэліяраваных землях;

б) аб практыцы зямельнай падзіткі зьвязку з пастановай XV зьезду УсеКП(б) на пытаньнях норм землякарыстаньня калектыўнага земляробства і аб правядзеньні абрэзкі;

в) эфэктыўнасьці ўкладаньняў у сельскую гаспадарку;

г) аб недрабімасьці сялянскай гаспадаркі;

д) аб арэндзе зямлі;

е) аб становішчы і сыстэме кіраўніцтва савгасамі;

ж) аб разьвіцьці прамысловага ільнаводства.

Загатоўка экспортнай сыравіны.

Захады да павялічэньня экспорту.

ПАШЫРЭНЬНЕ ГАДОЎЛІ ПТУШАК І ТРУСОЎ.

Дзеля павялічэньня таварнасьці сялянскай гаспадаркі, Наркамзем пастанавіў пабудаваць у БССР 3 заводы, на якіх будуць гадавацца птушкі і трусы. Гэтыя заводы маюць быць пабудаваны ў Менску, Гомелі і Віцебску. Першы завод будзе пабудаваны сёлета ў Менску, а рэшта—у 1929 г.

ЗАВОДЫ ДЛЯ АПРАЦОЎКІ ФРУКТАЎ.

Наркамзем намеціў да пабудовы 6 буйных і 50 дробных фруктова-гародна-вінных заводаў. Пабудова кожнага буйнага заводу будзе каштаваць да 200 тысяч руб. Заводы маюць быць пабудаваны ў Воршы, Гомелі, Магілеве, Бабруйску, Віцебску і Мазыры. Гэтыя заводы перапрацуюць у год да 2 мілёнаў пуд. садавіны.

На дробных заводах будзе арганізавана сушка ягад, грыбоў і іншай другарадная сыравіны.

Асаблівая ўвага будзе зьвернута на выпрацоўку яблычнага віна.

БУДЗЕ АРГАНІЗАВАНА 7 СЬВІНЫХ ЗАВОДАЎ.

Наркамзем праводзіць шэраг мерапрыёмстваў да пашырэньня гатунковага сьвіналодства. У працягу 2 апошніх гадоў у БССР мае быць арганізавана 7 сьвіных заводаў і 106 сьвіных рассаднікаў. Гэта дапаможа хутчэйшай гадоўлі гатунковых сьвіней для вывазу іх у выглядзе бэкону за межы.

У канцы 1928-29 г. экспорт сьвініны мае дасягнуць 630 тысяч руб., а ў 1929-30 г.—1180 тысяч рублёў.

МЭХАНІЗАЦЫЯ МАЛОЧНЫХ ЗАВОДАЎ.

Наркамзем распрацоўвае пытаньне арганізацыі экспорту малочных прадуктаў, у прыватнасьці галяндэрскага сыру і масла замежы БССР. Наркамзем узьняў пытаньне аб водпуску дадатковых сродкаў на ўзмацненьне з-за межаў абсталяваньня для мэханізацыі беларускіх малочных заводаў, што дасьць магчымасьць выпрацоўваць малочныя прадукты больш высокай якасьці і поўнага стандарту.

Элспорт яек неабходна ўзмацніць.

У кампаніі загатоўкі яек ёсьць два важныя моманты: першае—беспераебойная дастаўка насельніцтвам добраякасных яек і другое—экспорт іх за межы. Трэба прызнацца, што выканаць на 100 проц. тое і другое будзе нялёгка, а таму неабходна загадзя прыняць меры, каб з посьпехам правесьці гэту кампанію.

У даваенны час в Беларускі вывазілася 100-120 вагонаў яек. Пасьля дзесяцігадовага перарыву з Беларусі зноў пачаўся экспорт яек у 1923-24 годзе. Цяжка было наладзіць справу, але наступова ўдалося ахапіць беларускі рынак і завяваць замежны рынкі. Пры чым у 1926-27 годзе вывезена за межы 30 вагонаў яек.

Зараз ёсьць тэндэнцыя да складаньня пляну на 140 вагонаў яек, з якіх 60 вагонаў павінна загатовіць каапэрацыя, а 80 вагонаў—Белдзяржгандаль (выключна для экспорту).

Намечаны план загатоўкі 140 вагонаў яек немагчыма выканаць і патрэбен больш рэальны, больш жыцьцёвы плян.

Самае першае—для посьпеху справы ня трэба вызначаць шмат загатоўцаў. На рынку патрэбна максімум 2 загатоўцы. Такімі загатоўцамі павінны зьявіцца сельска-гаспадарчая каапэрацыя і Белдзяржгандаль.

Сезон загатовак набліжаецца; ёсьць весткі, што ў Слуцкім раёне ў справе гагатоўкі яек ужо наглядаецца нездаровая канкурэнцыя.

У мінулым годзе было экспартавана вельмі мала яек; сёлета экспорт гэтага тавару неабходна ўзмацніць.

Леўскі.

Наладзілі загатоўку сыравіны.

(м. Крайск, Плешчаніцкага раёну).

Спэкулявалі прыватнікі да гэтага часу сыравінай; ашуканству, здавалася, ня будзе канца. Адзін божыцца і клянецца, што «для пачыну толькі пераплачвае»; другі хітра абважвае. У выніку ўсяго гэтага—селянін едзе дамоў ашуканы. Так было перш.

Зусім інакш стаіць справа зараз. Крайскі каапэратыў пачаў прымаць усялякую сыравіну. Не таргуючыся, без ашуканства, за вызначаную цану, якая ўсім вядома, прыносяць сяляне ў каапэратыў свае тавары. Больш як на 2250 руб. купіў Крайскі каапэратыў шэрсьці, скурак і інш. І гэта ў працягу ўсяго некалькіх месяцаў.

— І чаму гэта раней не дагадаліся прымаць ад нас гэтыя тавары,—заўяляюць сяляне, выходзячы з каапэратыву.

Белдзяржгандаль за 10 дзён лютага экспартаваў на 98234 руб.

За першую дэкаду лютага Беларуская Управа Дзяржаўнага Гандлю экспартавала рознай сыравіны на 98234 руб. Галоўнае месца ў экспорце займае валакно лёну, якога накіравана на 32929 руб., далей пушніна—на 20.400 руб. і грыбы на 19.600 руб.

ПА ШЛЯХОХ „ГРАМАДЫ" ДА ВЫЗВАЛЕНЬНЯ.

Заходняя Беларусь, захопленая польскімі абшарнікамі на чале з «начальнікам дзяржавы» п. Пілсудскім, пасьля нядоўгага перыяду салодкіх яго абяцанак і пасулаў, убачыла, што з рук расейскіх чыноўнікаў і жандараў яна папала ў лапы польскіх паноў-абшарнікаў і польскай дэфэнзывы.

Калі царскі рэжым ня любіў нічога беларускага і па мядзьвежы прыдушыў праявы беларускасьці ў „Северо-Западном Крае", дык сьвежая ўлада польскіх абшарнікаў—у параўнаньні з царскай — адразу-ж выявіла нейкую шалёную нянавісьць да нянольскіх элементаў З. Беларусі.

Найлепш дзікая, вострая, хітрая, упартая, бязьлітасная барацьба з беларушчынай, якую ўсялякія панаехаўшыя з Паснані і Галіцыі польскія адміністратары мяшалі ў вадну кучу з расейшчынай.

За некалькі месяцаў улады ўраду маёвага перавароту і яго абшарніцкай адміністрацыі Зах. Беларусь вынесла больш ядзеяку і катаваньняў, як за дзесяткі гадоў царскай няволі.

Пад уплывам такіх спосабаў „вываженьня ад маскоўскай няволі" беларуская сьвядомасьць і беларускі разьвіцьцёвы рух расьлі, як на дрожджах Расэрсіі аказаліся найлепшым сродкам для ўздыму заспаўшага было нацыянальнага пачуцьця. Яно раптам праснулася і вылілася ў шмат рэвалюцыйных выбухаў і арганізаваных выступленьняў, нацыянальна-палітычнага і сацыяльнага характару проці польска-абшарніцкіх гвалтаў.

Ужо выбары ў польскі сойм у 1922 г., ня глядзячы на адносную слабасьць кіруючых беларускіх вярхоў, паказалі, што Зах. Беларусь гатова бараніць сябе ад новых прыгнятальнікаў і рашуча змагацца з імі.

Аднак, першыя выбары, якія [illegible] слоў сойму аказаліся і такія людзі бяз цьвёрдых пераконаньняў, якія потым ухіліліся ў бок усялякіх коншахтаў з польскімі ўрадавымі сфэрамі.

Так званы «Беларускі пасольскі клюб», які павінен быў-бы стаць на чале беларускага нацыянальнага руху, ня здолеў арабіцца кіраўніком і правадыром беларускіх мас, бо ў ім былі рознародныя па сваіх пераконаньнях элементы.

Зразумела, што такое становішча не магло цягнуцца. Народныя масы, якія спачатку спадзяваліся на сойм і на выбраных імі паслоў, патроху пераканаліся, што надзеі толькі на сойм і толькі на сваіх паслоў нічога не прынясуць. Грамадзкая беларуская думка шукала выхаду з тупіка. Пасольскі беларускі клюб у сваім цэлым ня быў здолен знайсьці гэты выхад. Шмат хто з беларускіх дэпутатаў і далей хацеў абмежавацца толькі парляментарнай барацьбою за інтарэсы беларускага народу і не хацеў пашырыць пасольскую працу ў бок беспасрэднай арганізацыйнай працы сярод шырокіх народных мас. А гэтага вымагае Зах. Беларусь.

Тупая, дзікая, пясумленная, пазбаўленая ўсякай дзяржаўнай думкі польская абшарнічная палітыка цягнулася і пры ўсіх наступных пасьля Пілсудскага польскіх урадах. Усе польскія ўрады толькі і ведалі, што браць з Зах. Беларусі непасільныя і шматлікія падаткі, браць рэкрутаў і за гэта біць і душыць усё беларускае і сілаю накідаць усё польскае. Гвалты і зьдзекі ў галіне культурна-асьветнай, зямельнай, сацыяльнай, эканамічнай, палітычнай і нацыянальнай—вось дзяржаўная праграма ўадносінах да Зах. Беларусі практыкавана ўсімі польскімі ўрадамі.

Зразумела, што пры такіх умовах [illegible] ў Зах. Беларусі заставацца ў [illegible]жэньні толькі парляментарнага [illegible]на сумленны палітычны дзеяч і [illegible] в брацец ад мсу права. На[illegible]ікаў яго і [illegible]—[illegible]гамагчы арганізавацца, каб потым цэлым мірам заявіць свой пратэст проці зьдзекаў і гвалтаў.

У Беларускім пасольскім клюбе даўно ўжо адчуваўся палітычны разброд. Станавілася ясным, што далей цягнуць клюбовую канцель у імя так званага фальшывага «адзінага нацыянальнага фронту» ня толькі няма сэнсу, а і праступна. Клюб у цэлым не здавальняў вымаганьняў шырокіх народных мас Зах. Беларусі і станавіўся бар'ерам на шляху яе жыцьцёвых патрэб.

Тады частка сумленных беларускіх паслоў, якія не прамянялі сваіх пераканаьняў і інтарэсаў народу на выгодныя пасольскія фотэлі, на кісеты з золатам і далярамі, на 1-ую клясу ў цягніках, аддзялілася ад «Беларускага Клюбу» і заснавала свой новы «Клюб Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады».

Гэта было ўлетку 1925 году.

Шырокія сялянска-работніцкія масы Зах. Беларусі жвава адгукнуліся на гэты факт і цалкам прыступілі да праграмы «Грамады».

У «Клюб Бел. С.-Р Грамады» ўвайшлі паслы: Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла, П. Валошын і Ю. Сабалеўскі, які пасьля арышту першых чатырох зрокся потым сваіх пераконаньняў і зноў уступіў у «Беларускі Клюб».

На аснове легальнага статуту «Грамады», дзякуючы шчырасьці і аддаванасьці працы яе кіраўнікоў і дзякуючы адпавядаўшай настроям і патрэбам мас праграме, «Грамада» вельмі шпарка расла, дасягнуўшы ў кульмінацыйным пункце свайго разьвіцьця статысячнага ліку. Можна сказаць, што ўся Зах. Беларусь стала пад сьцяг «Грамады» і яе праграмы.

Што-ж гэта за праграма, пад якою падпісалася ўся Зах. Беларусь?

Мы тут ня будзем падрабязна яе разьбіраць, бо на гэта патрэбна шмат месца, ды пры гэтым, хто хоча, можа яе перачытаць у «Інтэрпэляцыях» беларускіх паслоў у польскім сойме, якія ёсьць у кожнай кнігарні БССР. Скажам толькі, што праграма стаіць: за самавызначэньне народаў і міжнародную салідарнасьць працоўных, за саюз сялян і работнікаў, за сялянска-работніцкі ўрад, за зямлю сялянам бяз выкупу, за скасаваньне асадніцтва, за зьмяншэньне падаткаў, за разьвіцьцё каапэрацыі, за 8-мігадзінны рабочы дзень, за палітычныя свабоды, родную школу, проці нацыянальнага і сацыяльнага ўціску. І г. д.

У канцы праграмы ясна зазначаецца (§ 51):

„Ідучы да сваіх мэтаў, Б.С.-Р Грамада карыстаецца шляхам легальнай, законнай барацьбы на аснове канстытуцыі і права".

Такою была «Грамада». Яна ня ставіла свае мэтай выступленьняў па-за рамкамі канстытуцыі і права, аб чым урачыста засьведчыла ў сваёй праграме. Аднак, адна толькі спроба выкарыстаць да канца польскую канстытуцыю перапалохала яе аўтараў. Яны прывычаіліся ўжо былі, што канстытуцыя існуе так сабе і ва ўсякім выпадку не для «хлопаў», не для падняволных мужыкоў і рабочых Зах. Беларусі. Яны прывычаіліся лічыць беларускіх сялян і работнікаў толькі бязмоўным быдлам, якое ідзе, куды яго гоняць. А тут раптам пачуўся грозны голас народу, які перасьцерагаў аб набліжэньні канца народнага цярпеньня і голасна патрабаваў звароту сабе няпраўна адабраных правоў.

Гэтага было доволі, каб яснавяльможныя паны, абраныя законнымі вымаганьнямі зьняволенага народу, абрушыліся страшэннымі рэпрэсіямі і задушылі легальны, працаўны рух.

Выканаць гэтае заданьне ўрад Пілсудскага даручыў спэцу на ўдушэньню беларускага руху, прадстаўніку польскіх абшарніцкіх інтарэсаў на Ўсходніх крэсах, міністру «справядлівасьці» Майштовічу. Ён, відаць, доўга шукаў спосабаў праўнага зьліквідаваньня «грамадаўскіх» арганізацый, якія разьвівалі сваю дзейнасьць на аснове зацьверджанага «Статуту». Спосабаў гэтага знайсьці не удалося. Тады п. міністр справядлівасьці [illegible] ранішуся найсьці існуючым ужо на папярэдняй сваёй практыцы дэфэнзыўным спосабам. Па таемнаму загаду правінцыяльныя дзяржыморды пачалі фабрыкаваць ілжывыя фантастычныя даносы на «Грамаду», пачаліся арышты невядома за што выдатнейшых дзеячоў «Грамады», а потым і масавыя арышты. Адным словам—пачалі «рабіць» „Грамаду" антыдзяржаўнай, праступнай арганізацыяй і з узрастаючым адміністрацыйным тэмпам яе ліквідаваць.

Кампанію проці „Грамады" па загаду зьверху, а можа часам і па свайму ўласнаму перакананьню падняла і прэса-санацыйная і чорнасоценная. Пачалося ўлюлюканьне і цкаваньне проці «Грамады» як на панскім паляваньні. То там, то сям па ўсёй З. Беларусі адбываліся мясцовыя разгромы «Грамадаўскіх» арганізацый і зьездаў, найлепшай ілюстрацыяй якіх зьяўляецца разгром зьезду ў Бярозаве Бельскага пав., і пабіцьцё да крыві ўсіх прысутных на зьезьдзе, у тым ліку дв

ПАЗЫКА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

ЖАНЧЫНЫ І МОЛАДЗЬ—НАПЕРАДЗЕ.

Жанчыны даюць прыклад.

(Гарадецкі раён, Віцебскай акругі.)

З 1 да 15 лютага ў нашым раёне рэалізавана пазыкі на 780 руб., а з пачатку кампаніі на 2580 рублёў.

Сельсаветы разварушыліся. Напрыклад, у Аляксандраўскім сельсавеце мясцовы драмгурток выяжджае па вёсках, дзе ставіць п'есы, прыстасаваныя да папулярызацыі пазыкі.

Неабходна адзначыць, што сяляне—беднякі першыя падпісваюцца на пазыку.

Селянін-серадняк Сокалаў (Аляксандраўскі с-с) падпісаўся на 10 руб., але па настаяньні жонкі падпісаўся яшчэ дадаткова на 30 рублёў.

Наогул, жанчыны пазыкай вельмі цікавяцца. У Сяліцкім сельсавеце жанчыны сабралі палатно свайго вырабу, прадалі яго і зараз-жа купілі аблігацыі. Дэлегацкі сход Аляксандраўскага сельсавету цалкам падпісаўся на пазыку.

Пленум Кузьмінскага сельсавету цалкам падпісаўся на пазыку і выклікае членаў іншых сельсаветаў і раёнаў.

Трэба адзначыць, што настаўнікі не зьвярнулі належнай ўвагі на рэалізацыю пазыкі.

Дактары таксама сьпяць.

На сходах сяляне выносяць пажаданьне, каб дзяржава выпускала пазыкі ўвосень, калі сяляне маюць грошы.

П. ВОЎКАЎ.

Сьвядомая моладзь.

(Ад улясн. Гомельскага кар-та).

Кампанія рэалізацыі пазыкі ў акрузе разгортваецца.

Раённыя камісіі сур'ёзна распачалі працу па распаўсюджаньні аблігацый пазыкі. Ва ўсе сельсаветы насланы ўпаўнаважаныя па рэалізацыі.

Вызначанае заданьне можа быць в посьпехам выкананa. Лесбел заплаціў у акрузе сялянам за лесараспрацоўкі да 12 міліёнаў рублёў і лясьніцтва каля 13 міліёнаў. Усяго за год—25 млн. руб. З гэтых грошай нямала прыходзіцца на Хойніцкі і Рэчыцкі раёны. Частка гэтых грошай павінна пайсьці на рэалізацыю пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

Трэба адзначыць, што агітацыйная кампанія ня ўсюды праводзіцца добра. У некаторых сяленьнях сялянства мала яшчэ ведае аб выгадах пазыкі. Настрой сялян ня ўсюды аднолькавы. Бываюць выпадкі, што прыходзіць дзядзька в вёскі і просіць: «дайце аблігацыю за 20 руб.» Але бываюць і такія сяляне, якія яшчэ слаба разумеюць, што азначае пазыка.

У вёсцы Руданова, Хойніцкага раёну, 40 маладых хлапцоў злажыліся па 50 кап. і купілі калектыўна на 20 руб. аблігацый пазыкі. Апроч таго, 20 сялянскіх дзяўчын злажыліся па 25 кап. і купілі калектыўна пяцірублёвую аблігацыю.

У выпадку выйгрышу на адну з гэтых аблігацый, на атрыманыя грошы будзе куплен для вёскі гучнагаварыцель.

Батракі і члены прафсаюзаў прыхільна адносяцца да пазыкі. У савецкіх гаспадарках батракі купляюць аблігацыі пазыкі, праводзіцца калектыўная падпіска на аблігацыі пазыкі сярод вучняў школ.

У Гомелі працоўныя, якія жывуць у сельскіх мясцовасьцях, таксама падпісваюцца на аблігацыі пазыкі. Ужо рэалізавана да 5 тысяч рублёў.

Наогул, пры актыўным удзеле ўсёй грамадзкасьці заданьне на акрузе ў рэалізацыі на 500 тыс. руб. аблігацый пазыкі будзе выканана.

Чырвонаармейцы падпісаліся на 10.000 р.

ГОМЕЛЬ, 21-II. Кампанія рэалізацыі сялянскай пазыкі ў №-ім палку прайшла з посьпехам. У выніку кампаніі ў палку сабрана падпіска на пазыку амаль што на 10.000 руб. Першае месца па суме падпіскі заняла палкавая школа.

Падпісаліся ўсёй вёскай.

ВІЦЕБСК, 20-2. Па Гарадоцкім раёне на 15 лютага рэалізавана сялянскай пазыкі на 3120 руб. Наперадзе ідуць Сялішчанскі і Аляксандраўскі сельсаветы. Вёска Прудніці падпісаліся на пазыку ўся.

САБРАЛІ ПАДПІСКУ НА 4000 руб.

Менск. № кавалерыйскі полк сабраў падпіскі на пазыку ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на суму звыш 4000 руб.

У СЛУЧЧЫНЕ РЭАЛІЗАВАНА НА 12485 РУБ.

СЛУЦАК, 20-2. За час з 8 да 16 лютага ў Слуцкім раёне прададзена аблігацый сялянскай пазыкі з 4362 руб. 50 к., а з пачатку кампаніі—на 12485 р.

РАБОЧЫЯ ФАБР. «ГЭРОЙ ПРАЦЫ» ПАДПІСАЛІСЯ НА 2000 руб.

ГОМЕЛЬ, 21-II. Рабочыя фабрыкі «Гэрой Працы» падпісаліся на сялянскую пазыку на 2000 руб. Падпіска яшчэ працягваецца. Трэба адзначыць, што рабочыя таксама актыўны, як і пры рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі.

ПАКУЛЬ ЯШЧЭ СЛАБА.

ВІЦЕБСК, 21-II. Па вестках з месц, наперадзе усіх па рэалізацыі сялянскай пазыкі ідуць—Суражскі раён, які прадаў аблігацый на 2410 руб. і Гарадоцкі і Бешанковіцкі, якія рэалізавалі на 1300 руб. Зусім слаба стаіць справа ў Езярышчанскім раёне, дзе прадалі аблігацый пазыкі ўсяго на 550 руб., і Межынскі—які прадаў на 200 руб.

РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЗЫКІ АЖЫВІЛАСЯ.

ПАРЫЧЫ, 21-II. За тыдзень—з 8 да 16 лютага ў Парыцкім раёне прададзена аблігацый, сялянскай пазыкі на 3250 руб. З пачатку кампаніі па раёну рэалізавана пазыкі на 6117 руб. У апошнія дні рэалізацыя пазыкі ажывілася, і можна думаць, што заданьне выканаем.

Чырвоная армія абараняе мірную працу рабочага і селяніна.

Праверым нашу працу.

Наладзіць вучот сем'яў чырвонаармейцаў, узмацніць кантроль за выкананьнем законаў аб ільготах.

(Гомельшчына).

Адной з галоўных задач як акрывыканкому, так і нізавых савецкіх органаў і ўстаноў зьяўляецца праца па дапамозе вайскова служачым і іх сем'ям. І трэба сказаць, што гэтая праца стаіць далёка не на апошнім месцы ва ўсёй іх дзейнасьці.

Бясспрэчна, што дасягненьні ў гэтай справе ёсьць, бязумоўна, вялікія, але разам з гэтым нельга абыходзіць моўчкі і тыя недахопы, якія перашкаджаюць поўнаму і своячасоваму ажыцьцяўленьню законаў аб ільготах.

ВУЧОТ СЕМ'ЯЎ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ НЕ НАЛАДЖАН.

Адным з галоўных недахопаў зьяўляецца адсутнасьць вучоту. Адсюль, як вынік, мы маем тое, што Гомельскі АВК ня здолеў поўнасьцю выканаць запатрабаваньне ЦВК БССР даць справаздачу па гэтаму пытаньню. Ільготамі і дапамогай карысталіся ўсе сем'і вайскова-служачых, а падагуліць вынікі ўсёй працы, паказаць на канкрэтных лічбах усё тое, што зроблена ў справе практычнае дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў з прычыны адсутнасьці вучоту, вядома, нельга. І толькі па аснове вестак 4-х раёнаў: Сьвяцілаўскага, Гомельскага, Веткаўскага і Краснабудзкага мы можам рабіць вывады аб тым, як была пастаўлена гэта справа ў Гомельшчыне ў 1925-26 годзе.

ІЛЬГОТЫ ЎЗМАЦНЯЮЦЬ ГАСПАДАРКУ.

Так, у галіне сельска-гаспадарчай дапамогі сем'і чырвонаармейцаў карысталіся наступнымі ільготамі:

Па сельска-гаспадарчаму падатку па 4-х раёнах ільготы дадзены 559-ці сем'ям на суму 6.328 руб. 52 кап. На абавязковаму акладному страхаваньню па тых-жа 4-х раёнах ільготы дадзены 600 сем'ям на суму 964 руб. Выдадзены пазыкі на ільготных умовах—95 сем'ям. Адпушчана лесаматар'ялу на ільготных умовах 82 сем'ям і 4 сем'ям дармова. Дадзены ільготы пры пакупцы жывога і няжывога і сельска-гаспадарчага інвэнтару—19 сем'ям і г. д.

ДАПАМОГА БЕСПРАЦОЎНЫМ ЧЫР-ЦАМ.

У час беспрацоўя дэмабілізаваныя чырвонаармейцы карысталіся дапамогаю ад страхкасы ў разьмеры 13 руб. 50 кап. у месяц. За перыяд з 1-га жніўня 1926 г. па 1-ае красавіка 1927 г. дапамогу па беспрацоўю атрымлівалі 200 чал.

Апрача гэтага, беспрацоўныя карысталіся дармовымі абедамі, штодзёнь ад 40-550 чал. і ад 30-35 чал. дармовымі начлегамі ў інтэрнатах.

У далейшым перад савецкімі органамі і ўстановамі Гомельшчыны стаяць наступныя задачы:

Трэба ў першую чаргу наладзіць вучот сем'яў вайскова-служачых, іх масавага становішча і вучот тэй дапамогі і ільгот, якія ім даюцца адпаведнымі органамі і ўстановамі. Неабходна ўзмацніць кантроль за выкананьнем законаў аб ільготах.

Больш шырока папулярізаваць кодэкс законаў аб ільготах сем'яў чырвонаармейцаў сярод працоўных мас насельніцтва.

ТДА-АВІЯХІМ—ЗЬВЯНО ПАМІЖ ПРАЦОЎНЫМІ І ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ.

(Акруговы зьезд ТДА- Авіяхіму).

НЕДАХВАТЫ НА МЯСЦОХ.

На вячэрнім пасяджэньні 20 лютага адбыліся спрэчкі па справаздачах т.т. Валаснова і Харытонава.

Выступаўшыя таварышы з раёнаў зазначалі, што гурткоў у раёнах шмат, але да выкладаньня ў іх вайсковых і авіяхімічных ведаў з боку некаторых таварышоў праяўляецца мала зацікаўленасьці, бо гэта праца не аплачваецца.

— Былі выпадкі, калі некаторы час камскład за выкладаньне аплачваўся, тады заняткі ішлі нармальна.

Селянін тав. Серафімовіч зазначыў, што сялянства бязумоўна ўступала-б у ТДА-Авіяхім, каб ведала аб яго задачах.

АДОЗВА ДА НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ

Акруговы зьезд ТДА-Авіяхіму ўхваліў адозву да навуковых працаўнікоў БССР у якой зазначана:

— Савецкая ўлада дала вам магчымасьць мірна працаваць на карысьць культуры працоўных мас. Сусьветны капітал хоча сарваць наша мірнае гаспадарчае і культурнае будаўніцтва. Уступайце ў ТДА-Авіяхім, наладжвайце навукова-дасьл. працу ў яго гурткох.

ЗА СУВЯЗЬ ПРАЦОЎНЫХ З ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ.

Ад імя Ўсебеларускага Савету ТДА-Авіяхіму і ад імя ўраду БССР, зьезд прывітаў тав. Галадзед.

— Працоўныя Савецкага Саюзу,—кажа тав. Галадзед,—пры дапамозе ТДА-Авіяхіму наладзяць шчыльную сувязь з Чырвонай арміяй і ў патрэбны момант дадуць ворагу рашучы адпор. У гэтай працы ТДА-Авіяхіму дапамогуць навуковыя сілы БССР.

ЗАКОНЧАНЬНЕ ЗЬЕЗДУ.

На зьезьдзе выбран акруговы савет ТДА-Авіяхіму, у склад якога ўвашло 35 чалавек.

На ўсебеларускі зьезд абрана 17 чал. з правам рашаючага і 13 чал. з правам дарадчага голасу. У склад дэлегатаў увайшлі тав. Галадзед, Барсукоў, Валасноў і інш.

ЗОРКА НА ЛБЕ.

(З успамінаў камсамольца).

Ізноў павялі на допрос. Прывялі ў пякой. Я стала сядзелі тыя-ж афіцэры, побач стаяў доўгі поп. Мы спыніліся ля дзьвярэй. Першым загаварыў поп, павольна, з хітрасьцю.

— Бач, калі вы скажаце, колькі там вашых, дык іх менш па стане... Скажэце праўду і... (бог казаў заўсёды праўду гаварыць) мы вас вызвалім... што за охота прападаць... так пізавошта. Ніхто і не даведаецца... Дарэмна загінеце...

— Ну і няхай,—я агідаю выгукнуў Васька.

Поп нахіліўся да афіцэраў і пра нешта стаў ім гаварыць, потым уставіўся на нас і сказаў:

— Тады пакатуйце іх,—і вышаў у другі пакой затым, як відаць, каб ня ганьбіць сябе катаваньнем.

З-за стала выйшлі ўсе ўтрох. Адзін ішоў наперадзе. Ён мякка падышоў да Ваські, з хвіліну гледзячы яму ў вочы, і раптам з размаху даў аплявуху. Акрываўлены Васька зваліўся на падлогу. Той-жа афіцэр падышоў да мяне, прыцэліўся вачыма...

У вушах зазьвінела і я перакуліўшыся, выцяўся носам аб падлогу.

Нас паднялі.

Афіцэры, наперабой адзін перад адным, пачалі крычаць, тыкаючы кулаком у грудзі і твар.

— Скажаш, чырвоная свалата?

— Ня ведаеш, сукін сын, ня ведаеш?

— Я т-т-абе пак-кажу...

Адзін, нарэшце, спыніў іншых, падбег да стала, наварушыў нешта там і прынёс жалезную зорку.

— Ня ведаеце... Паглядзімо...

Пры гэтых словах ён запаліў сьвечку, і напёк над ёю дачырвана пяцікантовую зорку.

— П-паглядзімо...

Нас прыціснулі да сьцяны і пачалі прыклалі да лба па зорцы.

Боль прасякнуў усё цела. Крыўда ўзнімалася проці трох гадаў, але словы ня ішлі скрозь сьціснутыя зубы.

Пячаці не дапамагалі. Тады адзін з афіцэраў схапіў як і пачаў грэць яго на полымі сьвечкі.

Ваську разадралі кашулю і афіцэр паліў яму на бруха і па грудзі расплаўлянага ляку, прыціснуўшы яго пекаю пячаткаю.

Васька мыкаў зд болю, вочы яго набрынялі крывёю.

Чарга дайшла да мяне. Адзін з афіцэраў паваліў мяне, двое другіх сьцягнулі нагавіцы, прыціснулі ногі да падлогі. Ліўся ляк, расплаўляючыся над сьвечкаю. Кожная кропля прымушала выгінацца дугою, напружвацца ад душыўшага крыку...

— Даволі, цісьніце, пячатку,—загадваў штабс-капітан і засопшыся ад дыхавіцы цяжка роў, схіліўшыся над тварам:

— А, мо' скажаш? А-а? Скажаш, падлюга,—і выстукваў па галаве кончыкам бота.

Забава, якая падышала афіцэраў, як відаць, вдакучыла ім і нас пагналі назад у астрог. У камеры мы ўжо адчунялі...

Пасьля гэтага каты сунялісь. Гэта занепакоіла нас.

Толькі поп заходзіў у камеру, угаварваючы сказаць праўду, і выходзіў з нічым.

Так праседзелі месяц. Марылі пра сваіх, далёкіх.

І раптам, што было далёка,—зрабілася блізка.

Чырвоныя ішлі на Краснадар. Мы ўжо чулі далёкую стрэльбіну!

Яна была ўсё чутней.

Чырвоныя занялі горад.

Згаладалых, скатаваных нас вызвалілі з астрогу.

Ізноў воля. Сустрэліся са сваімі знаёмымі таварышамі і доўга апавядалі пра драпежніцтва Дзянікіна, узьнімаючы нянавісьць чырвоных барацьбітоў.

Савін.

Маленькі фэльетон.

... І З ВАШЫМІ ПРЫВАТ-ДАЦЭНТАМІ!..

У пакоі інтэрнату каля вялізарнай кнігі сядзела чалавек дзесяць студэнтаў.

Студэнты глядзелі ў вялізарную кнігу і відавочна былі няпрытомнымі.

Раптам пахмурна адзін з прысутных загаварыў:

— Сколькі будзе два памножанае на два?

— Два памножанае на два ня іначай, як будзе сем,—няўпэўнена адказаў нехта з прысутных.

Я падыйшоў бліжэй, паглядзеў па адказаўшага і са спачуваньнем запытаўся:

— Вы ў нашым унівэрсытэце праходзіце курс?

— Так!—ціха адказаў студэнт і, паглядзеўшы на вялізарную кнігу, зьбялеў і прыціх.

Тады я, каб расьсеяць сумленьні гэтага выхаванца нашай вышэйшай школы, сумленна адказаў:

— У даваенны час, калі хто памножаў два на два, дык казалі, што было чатыры...

Студэнты засьмяяліся.

Мне зрабілася жудасна, але каб болей не раздражаць нашых будучых прыват-дацэнтаў, няшчыра засьмяяўся і я.

— Откиньте всякий страх и можете держать себя свободно!—гледзячы па вялізарную кнігу раптам сказаў адзін студэнт і зьвярнуўшыся ўжо непасрэдна да мяне, ён дадаў:

— Будьце ласкавы, прачытайце і вы вось гэную кнігу.

Студэнт паклаў перад мною кнігу: «Лекцыі па гісторыі беларускае мовы» прыват-дацэнта Воўка-Левановіча і сам адыйшоўся.

... І праз паўгадзіны я ўжо калачыў валасы, праз гадзіну я зьбялеў, а яшчэ праз паўгадзіны студэнты, паглядзеўшы на мяне, ціха пыталіся:

— Колькі цяпер два памножанае на два?

— Сем!—ціха адказаў я і яшчэ болей зьбялеў...

Сем, чорт набяры, сем!

Бо, калі вучоны мовазнаўца Беларускага Унівэрсытэту па катэдры беларускага мовазнаўства сьцьвярджае, што словы: «строгій, строкі, арыхметіка, хвізіка, пандравіліся» і г. д. ёсьць беларускія словы і ўсё яшчэ застаецца прыват-дацэнтам, дык я сьмела буду сьцьвярджаць, што два памножанае на два ёсьць сем, і як сем ёсьць болей чатырох, дык я буду дамагацца, каб мне далі годнасьць прыват-дацэнта па катэдры вышэйшай матэматыкі.

Кажуць, што Воўк-Левановіч у гэты час яшчэ нешта піша «па» нашай шматпакутнай мове.

Паважаны вучоны, а ўсё-ж такі падвучыце крыху нашую мову, бо як вы ёсьць наш вучоны мовазнаўца, дык неяк нязручна з гэтага боку вам быць няпісьменным.

Падвучыцеся! Мы пачакаем...

Мы шмат вякоў чакалі...

Алёша.

Страхоўку трэба сабраць у тэрмін.

У НЕДАБОРЫ 1.253.000 РУБЛЁЎ СТРАХАВЫХ ПЛАЦЯЖОЎ.—1 САКАВІКА—АПОШНІ ТЭРМІН УЗНОСУ СТРАХОЎКІ.—ВІНАВАТЫХ У ЗРЫВЕ КАМПАНІІ—ПАД СУД.—НАЙГОРШ ПАСТУПАЕ СТРАХОЎКА Ў ПОЛАЦКАЙ, АРШАНСКАЙ І МАГІЛЕЎСКАЙ АКРУГАХ.

Ня гледзячы на цэлы шэраг дырэктыў ураду аб своячасовым зборы страхавых плацяжоў, тэмп паступленьня страхоўкі зусім слабы. Паступленьне страхоўкі ў першай палове лютага горшае, чым было ў другой палове студзеня. За першую палову лютага паступіла 397000 руб., ці 10 проц. гадавога акладу, а ўсяго з пачатку году паступіла 2876000 руб., ці 69,6 пр. налічанага акладу. Як відаць, недабор вельмі вялікі (1253000 р.), які павінен паступіць да 1 сакавіка г. г.

Найгорш паступаюць страхавыя плацяжы ў Магілеўскай акрузе, дзе недабор дасягае 251000 руб. (ці 33,5 проц.), а за першую палову лютага на Магілеўскай акрузе паступіла ўсяго толькі 6,9 проц. гадавога заданьня. Гэтыя лічбы па Магілеўскай акрузе сьведчаць аб надбайных адносінах з боку адпаведных працаўнікоў да збору страхоўкі.

Паступленьне страхоўкі ў Аршанскай і Полацкай акругах таксама зусім слабае. За першую палову лютага гэтыя акругі выпаўнілі толькі на 10 проц. гадавога заданьня і ў працягу ўсёй кампаніі ідуць на апошнім месцы. Так, напрыклад, у Аршанскай акрузе лічыцца недабору 169000 руб., а ў Полацкай—99000 руб.

Ня відаць ніякага палепшаньня ў паступленьні страхоўкі і ў Бабруйскай акрузе, дзе ў недаборы лічыцца 198000 руб.

Назіраецца таксама слабае паступленьне страхоўкі ў Менскай акрузе. Цікава адзначыць, што Менская акруга за другую палову студзеня выканала 17,9 проц. гадавога акладу, а за першую палову лютага—11 проц. Тут вывад ясны: **нядбайныя адносіны да выкананьня страхоўкі, якой лічыцца ў недаборы 194000 руб.**

Гомельская акруга вельмі рана супакоілася. Займаючы першае месца, пачала спускацца ўніз і за першую палову лютага выканала толькі 5 пр. налічанага акладу.

Значна палепшылася паступленьне страхоўкі ў Мазырскай акрузе, якая за першую палову лютага выканала 25,2 проц. гадавога заданьня. Калі гэтак пойдзе і далей, то Мазырская акруга выканае страхоўку своячасова.

Да 1 сакавіка застаўся толькі тыдзень. Разлічваць на дабрахвотную здачу страхоўкі ня прыходзіцца, і трэба прыступіць да прымусовага спагнаньня страхоўкі, прыцягваючы да адказнасьці злосных неплацельшчыкаў.

Акрвыканкомам і РВК трэба зараз-жа ўжыць самыя рашучыя меры да выпаўненьня страхоўкі ў тэрмін, г. з. да 1 сакавіка.

Падрыхтоўка да міжнароднага жаночага дню.

Па лініі КСУ.

Па лініі КСУ ў вёсках будуць зроблены даклады аб дапамозе жанчынам-бяднячкам. Згодна прапаноў ЦК КСУ ў кожным сельсавеце будзе вылучана 2 гаспадаркі ўдоў і 2 гаспадаркі сем'яў чырвонаармейцаў для іх капараваньня. Апроч гэтага, будзе аказана садзейнічаньне працоўнай сілай у пабудове для бедных удоў дамоў і інш.

Па с.-г. каапэрацыі.

У камунах „Зорка" і „Новае жыцьцё" будуць пабудаваны дзіцячыя яслі. Пры 5 калгасах кожнай акругі будуць будавацца гаульныя кухні, сталовыя і прамы, а ў некаторых калгасах—пляцоўкі.

У Віцебскай і Полацкай акругах арганізуюцца ільнамяльныя т-вы.

Па спажывецкай каапэрацыі.

З фонду каапэраваньня беднаты для каапэраваньня жанчын вылучана 8 10 проц. Дадзены ўказаньні месцам аб адчыненьні дзіцячых устаноў (яслі, пляцоўкі) у гэтым годзе.

Чырвоны крыж.

„Чырвоны крыж" адпускае на 500 руб. на акругу для пабудовы яслі, пляцовак і інш.

Пацікавіўся, прачытаў і... пашкадаваў, што прачытаў.*)

О. В. ВОЎК-ЛЕВАНОВІЧ.

Язэп Лёсік ушанаваў мае „Лекцыі па гісторыі беларускай мовы" сваёй увагай. Калі я прачытаў першую частку яго артыкулу (у № 28 «Сав. Бел."), то, праўду сказаць, жаданьня адказваць у мяне ня было. Але, зважаючы на заключныя словы Я. Л. (у № 29 «С. Б.»), дзе мне прапанавана нават „програма" для адказу, я заключыў, што гэтага дочаша якраз ня мяне, але самому Я. Лёсіку. А калі так, то не асьмельваюся ня выпаўніць яго жаданьня.

Перш за ўсё для мяне незразумела: якое начыненьне да маіх „Лекцыяў" мае артыкул у № 234 «Зьвязды» за мінулы год і мой адказ на яго ў здным з наступных №-роў той жа «Зьвязды»? Мусібыць гэта вразумела толькі самому Я. Лёсіку. Можна было-б «сестрить» наконт гэтага прыказкай, ужытай самім Я. Лёсікам (пра доўгі дзятлаў нас), але прыкра перайманць падобны тон.

Гэтак, значыць, на сутнасьці.

Адказваю на пункту 1: Правапіс. Фактычная спраўка: рукапіс маіх лекцыяў у свой час быў напісаны маёй рукой згодна з маім пунктам гледжаньня на правапіс у галіне перадачы па-беларуску слоў чужаземнага паходжаньня. Гэты пункт гледжаньня добра ведомы Я. Лёсіку з маіх неадпаразовых выступленьняў на тэму пытаньню як у ІБК, гэтак і ў навуковым таварыстве пры Бел. Дз. Унівэрсітэце. У апошнім я, нават, чытаў даклад на гэтую тэму, на якім дакладзе, паміж іншых, быў і Я. Лёсік. І сваіх поглядаў я ві ад кога не хаваю.

У кароткіх словах яны такія.

На мой погляд, словы чужаземнага паходжаньня павінны быць у сваёй масе падпарадкаваны нашай беларускай фонэтыцы, у якой асноўным (славянскага паходж.) словы вымаўляюцца за вельмі незначнымі выключэньнямі з памякчэньнем зычных перад е, і; памякчэньне ж зычных д і т перад е, і настолькі моцнае, што яны нават пераходзяць у белар. мове ў афрыкаты д' з'—т' с' (з, с). Гэты-ж закон пашыраецца на зычныя і ў словах чужаземных, калі яны трапляюць у народ; гэтак, беларускія сяляне пераважна вымаўляюць дзісцыпліна, арыхмеціка, канфрэнцыя, пазіцыя, інвэнтар і пад. Праўда, што ёсьць некалькі слоў, якія вым. і з цьвёрд. зычнымі (напр.: дарэктар, дакляраваць, сапат, або сапот і некат. інш.); але, як з гэтым згаджаецца і, нават, сам гэта заўважыў Я. Лёсік (няхай ён прыпомніць свае словы на маім і А. Багдановіча дакладах), вымаўленьне з цьвёрдымі зычнымі ў словах чужаземнага паходжаньня перад е, і а таксама з мяккім л перад а, о, у наш час можна пачуць толькі ад вельмі старых людзей; усе-ж іншыя сяляне, пачынаючы прыблізна з 60-гадовага ўзросту і маладзей, кажуць дзісцыпліна, або дзісцыпліна, арыхмеціка, лампа, клас і г. д.

У сваім дакладзе ў Навуков. Т-ве я, паміж іншым, прапанаваў, каб у словах чужаземнага паходжаньня захоўваць пасьля зубных (д, т, з, с) і л чужаземную (пераважна грэцка-лацінскую) транскрыпцыю, г. зн. пісаць: дісцыпліна (альбо, нават, дісьціпліна), консьтытуція, дыалект, морфологія, філологія і г. д.

Падставы для пісаньня ў чуж. словах л, злучаючы з а, о, таксама—у нашай фонэтыцы: у нашых, беларускіх, словах л перад асноўнымі славянскімі а, о—заўсёды цьвёрдае; напр.: лаўка, лава, лазіць, лазьня, лакомы, лоб, лось, лодка, ложак і г. д. Мяккім л бывае ў нас толькі перад тымі а, о якія зьявілася на месцы асноўных славянскіх галосных пярэдняга раду (е, ę, ь); напр.: лёп, лёд, лёгкі, ляда, ляжка (л'оп, л'ох, л'охкі, л'ада, л'ашка), якія заходзяць з ст.-слав. (уласна—праслав.): льнъ, ледъ, лъгъкъ, ледо (ледина), ледвіа і г. д.

Такім парадкам, калі мы пішам словы чужаземнага паходжаньня з ё, альбо з паскля л, то робім памылку і з пункту гледжаньня сваёй і з пункту гледжаньня чужаземнай фонэтыкі. Іменна, мы пішам у словах чуж. паходж. тыя ё і я, якія ў нас (а не ў чужаземцаў) адпавядаюць старым е, ę, ь, а ў чужых мовах адпавядаюць іхвым асноўным а, о; напр.: лёс (ням. Los), філёлёг (лац. philologus), лаконічны (л. laconicus), лямпа (ням. Lampe) і г. д.

Калі-ж правесьці ў правапісе чужаземных слоў паказаны намі прынцып, то мы дасягнем і большай адпаведнасьці нашай граф.чна-правапіснай сістэмы гістарычнай фонэтыцы беларускай мовы, і лепш захаваем адпаведнасьць чужаземнага слова яго роднай графіцы. Апроч таго мы такім пісаньнем установім прынцып „адчыненых дзьвярэй" для вымаўленьня слоў чужаземнага паходжаньня беларусамі, для многіх з якіх вымаўленьне іх з э, ы пасьля зубных, і [illegible] пасьля л—надзвычайна цяжка. Паогул, тагды вымаўляць будуць гэтыя словы як каму лягчэй, і ў гэтым ніякай бяды для балар. мовы ня будзе.

Поўнае супадзеньне з выказанымі мною думкамі адносна перадачы слоў чужаземнага паходжаньня знаходзім, напр., і ў выданьнях Украінскай Акад. Навук, пры чым у іх нават заўважаецца і нявытрымананасьць у гэтай галіне дакладна такога-ж характару, як у маёй кніжцы. Гэтак, напр., я маю кніжку: «Украінська Академія Наук. Сьбірник істор.-філолог. відділу № 48 проф. Петро Бузук. Нарис історії української мови. Вступ, фонетика і морфологія з додатком історичної хрестоматії. У Київі 1927». На адваротце тытульнага листа чытаем: „Замовл. № 870—2000", г. зн.—тыраж 2000 экз.

У кнізе знаходзім такія прыклады нявытрымананасьці у словах чужаземнага паходжаньня: студіюваньня; дыялектычна риса (перадмова, 5), студіюючи, діалектологі(7), до Балтійского моря (9), діалектологічна класіфікація" і гэтак на ўсёй кнізе; гэта значыць пішацца яраз так, як прапаную я. Адвак прынцып гэты тут ня вытрыманы; бо пішацца і класіфікація (11) і класифікації (7, 11), класифікації (15) і г. д. Такім парадкам у такой транскрыпцыі слоў чуж. паходжаньня таксама можна бачыць нявытрымананасьць, паколькі пішацца: діалект, діякона (17), класіфікація і пад. і побач: лінгвістичні (16), політичної, класифікація, тип, класифікація і інш. І гэта—ў кнізе, выданай Акадэміяй Навук для шырокага карыстаньня, як відаць з такога саліднага тыражу (2000 экз.).

«Як глядзець на такое неахайнае пісьмо?»—пытаецца ў мяне Я. Лёсік (у адносе да мае кніжкі). Гэтаму ёсьць прычыны чыста выдавецкія; хоць я і трымаюся іншага чыма прыняты ў беларускай правапіснай традыцыі прыкладу ў транскрыпцыі слоў чуж. паходжаньня, але зусім ня маю на ўвазе агітаваць за свой погляд, даючы свой правапіс чуж. слоў у кніжцы. Аб'ясьненьне-ж нявытрымананасьці вельмі простае: мае лекцыі пісаліся не для друку, але для чытаньня студэнтам. Калі з маіх запісак склаўся цэлы сістэматычны курс, я рашыў надрукаваць яго для патроб галоўным чынным студэнтаў-лінгвістаў. З гэтай мэтай я даў свае запіскі перадрукаваць на машыны тром машыністкам, даўшы ім наказ: выправіць траскрыпцыю чуж. слоў па прынятай у нашым друку традыцыі. Але машыністкі ў адных мясцох выправілі згодна з маім наказам, а ў другіх (у большасьці) пакінулі транскрыпцыю рукапісу.

Пры друкаваньні-ж на раттатарэ, як вядома, корэктуру (па васкоўках) рабіць, вымагчыма. Бось якім парадкам зявілася нявытрымананасьць у правапісе чужаземных слоў.

Такім чынам, я і пусьліў сваю кніжку ў зварот паогул, дык гэта таму, што яна трапляе амаль выключна альбо ў рукі студэнтаў-лінгвістаў, альбо спэцыялістаў вучоных, якія правапісу на маёй кніжцы вучыцца ня будуць, бо альбо яго добра ведаюць і, прачытаўшы мае лекцыі, не разьвучацца (студэнты-лінгвісты), альбо ня маюць патрэбы яму абучэцца (большасьць вучоных, з якімі я ведаю абмен друкаванымі працамі). Прытым тыраж кніжкі такі незначны (100 экз., бо 4 аказаліся сапсаванымі), што вялікай шкоды яна не змагла-б нарабіць, нават калі-б я пусьліў у продаж увесь тыраж; але фактычна я даў у продаж толькі 24 экз. на ўсю Беларусь.

Як я адношуся да беларускае мовы, „як выкладчык у школах?"—пытаецца Я. Л. у канцы 4 п. з разьдзелу «Правапіс» сваёй анкеты. Даю маленькую спраўку: у школах я не выкладаю, а толькі ў адным Унівэрсітэце.

Сутнасьці самога пытаньня не разумею: цераэлін шырока і навэўна пастаўлена. Калі Я. Л. мае на ўвазе мае суб'ектыўныя адносіны да бел. мовы, то я не люблю, як мову сваю, маіх бацькоў, дзядоў і прапрадзедаў. Калі-ж Я. Л. разумее ў гэтым пытаньні мае навуковыя погляды на беларускую мову, то зусім ясны адказ знойдзе якраз у маіх «лекцыях», якія ён дарэмна не дачытаў да канца, альбо не зразумеў, ці не захацеў зразумець. Між тым іх „выкладаньне простае і добра зразумелае", як кажа адзін з рэцэнзентаў рукапісу маіх лекцый, які (рукапіс) падаваўся ў свой час у Мотадком.

На сутнасьці пытаньняў, закранутых Я. Лёсікам у іншых пунктах яго «анкеты», вельмі цяжка адказаць каротка ня толькі таму, што гэтых пытаньняў шмат, але яшчэ і таму, што радыкальная самой анкеты вельмі тэндэнцыйная і рабілася вельмі простым мэтадам: з маёй кнігі Я. Л. выхапіў асобныя фразы, без сувязі з запярэднім і наступным тэкстам, зьмяняў гэтыя фразы сваім уласным тэндэнцыйным тлумачэньнем і ўжо пасьля таго задае пытаньні. На такую анкету мае-б заставаўся дадзь адзіны адказ Я. Лёсіку: паразіць яму больш уважліва фразы пазыхопліваў, каб пракавацца, што ў контэксьце яны далёка ня робяць таго ўражаньня, на якое разьлічвае Я. Л., падтасоўваючы асобныя сказы.

Але, паколькі я тут не спрачаюся з Я. Лёсікам, як на гэтае разьлічваў ён сам, але зварачаюся з раз'ясьненьнямі да аб'ектыўнай масы чытачоў „Савецкай Беларусі", якія, на маюць маёй кнігі і сярод якой тэндэнцыйнае асьвятленьне кніжкі Я. Лёсікам мэтаў зрабіць пэўны эфект, я лічу магчымым абмежавацца толькі вылучэньнем сутнасьці мэтадаў крытыкі Я. Лёсіка.

Для гэтага абмяжуюся адказам толькі на некаторыя пункты „анкеты" Я. Л., прапануючы апошняму выступіць з рэцэнзіяй (навуковай) на маю кніжку альбо ў ІБК, альбо ў Навуков. Т-ве пры Б. Дз. У. Там я магу адказаць Я. Лёсіку на ўсе пункты.

А пакуль што возьмем, напр., з праграмы Я. Л. пункт «Мова» і супінемся на маім слоўніку.

Тут напастаўлена Я. Л. столькі кліччкаў, што, каб даць усе падставы для ўжываньня ўсіх гэтых слоў мною, трэба б запяць не адну старонку „Сав. Беларусі". Таму, ізноў такі, бяру толькі некаторыя словы. Напр., у мяне ў прадмове: „самога зламыслія" (падчырнуга Я. Лёсікам, як расейская слова).

Дазволю запытацца: чаму Я. Л. лічыць гэтае слова толькі расейскім? А хіба ж у нас няма—побач з „выкладань", „класці"—таксама: зламыць, заламыць, палож, паклады—побач з „пакладзі"? І можна-б „папрасіць Я. Лёсіка ня блутаць рас. „изложение" з беларускім „зламыньне", якія як у напісаньні, гэтак і ў гучаньні значна адрозьніваюцца. А калі ў іх ёсьць агульна сэнс, дык хто ў гэтым вінаваты? —Агульнаславянскае паходжаньне кораню гэтых (беларускага і расейскага) слоў—адказам мы.

Далей у мяне: „прыятным абавязкам".

У гаворках Цэнтральнай Беларусі найб

Вясковая каапэрацыя.

Жанчыны-пайшчыцы папаўняюць пай.

(Па вестках з мейсц).

На неабходнасьць папаўненьня паявых узносаў для паляпшэньня каапэрацыйнага абслугоўваньня шырока адгукнуліся жанчыны. Па гэтаму пытаньню ёсьць гэткія паведамленьні з мясц: «з боку жанчын наглядаецца куды большая гатоўнасьць да папаўненьня паёў, чымся з боку мужчын. Жанчыны купляюць маркі на 2-3 рублі адразу».

Увогуле, задача аб неабходнасьці папаўненьня паявых узносаў і здачы зернавых і сыр'явых прадуктаў у каапэратыў асазнана. Маюцца гэткія заявы з боку сялянства: «Ніводнага фунта хлеба не дадзём прыватнікам».

Ход кампаніі пакуль затрымліваецца тым, што асобныя каапэратывы не вразумелі яшчэ значэньня яе. Ачыжскія працаўнікі, Чэрвенскага раёну, замест правядзеньня практычных мерапрыёмстваў для выканаьня данага ім заданьня, на пасяджэньні праўленьня прабілі цэлую дыскусію і гаварыльню і ў канцы канцоў перайшлі на асабістыя спрэчкі. У выніку, за першыя 20 дзён імі сабрана паявых узносаў 19 р. 50 к. і хлебных прадуктаў загатоўлена 32 пуды.

У іншых спажывецкіх таварыствах кампанія праходзе пасьпяхова. З Койданаўскага спаж. т-ва паведамляюць, што за апошнія 10 дзён студзеня сабрана паявых узносаў 557 руб. 41 к. і загатоўлена хлебных прадуктаў 2623 пуд.

У Пухавіцкім т-ве паявых узносаў за той самы час сабрана 592 р. і загатоўлена хлебных прадуктаў 292 п. і пушніны на 898 руб.

У Смалявічах паявых узносаў сабрана 1187 р., хлебных прадуктаў загатоўлена 2380 п., рознае сыравіны і пушніны на 959 руб. 97 кап.

З Заслаўскага т-ва паведамляюць, што паявых узносаў сабрана 241 руб. 36 к. і зернавых прадуктаў загатоўлена 905 пудоў.

Агулам за студзень месяц паступіла паявых узносаў 37.106 р. 55 к. **В.**

Расьцём і мацнеем.

Зараз усіх пайшчыкаў налічваецца 688 чалавек з паявым капіталам у 2688 р. 82 к., што складае ў сярэднім на аднаго пайшчыка 3 р. 90 к.

Да наступнага бюджэтнага году пайшчыкі ўхвалілі павялічыць пай да 4 р. 60 к. у сярэднім.

Прыбытку за 1926-27 бюджэтны год атрымана 1204 р. 27 к., а зварот 74585 р. 35 к.

Накладныя выдаткі складалі да пакупной каштоўнасьці 5 проц., а накладаньне на сабекаштоўнасьць тавараў у сярэднім—9 проц.

Дырэктывы аб зьніжэньні цэн выкананы поўнасьцю, а на гандлёвыя выдаткі зьніжэньне дасягнула да 11,6 проц., а трэба было давесьці да 15 пр.

Атрыманы прыбытак сход пайшчыкаў разьмеркаваў так: 120 р. у фонд каапэраваньня беднаты, на выдачу дывідэнта 216 р., на пабудову самалёта «Бел. Каапэратар»—24 р., у фонд узаемадапамогі спажыв. таварыстваў пры Менскім аддзяленьні 5 проц.—60 руб. і ў фонд аснаўнога капіталу 664 руб. 27 кап.

У далейшым пайшчыкі ўхвалілі праводзіць льготнае каапэраваньне сяброў сям'і пайшчыкаў, што дасьць большую магчымасьць каапэраваць моладзь і асабліва жанчын.

Імкнуцца да забясьпечаньня насельніцтва с-г. прыладамі.

Утварыць па больш буйнейшых насельных пунктах ініцыятыўныя групы, якія-б дапамагалі растлумачваньню ідэй каапэраваньня сярод сялян.

Утварэньне гэтых груп праўленьнем зараз праводзіцца па вёсках.

Цяпер галоўная ўвага каапэратывам зьвернута на хлебазагатоўкі і загатоўкі пушніны і скуры.

Найлепш абстаіць справа з загатоўкай жыта, трохі горш з семям лёну, а таксама з паявымі ўзносамі.

Унясьненьне апошніх затрымліваецца адсутнасьцю заработкаў.

Па шмат якіх вёсках сяляне на сходах казалі:

«Пашлеце нас у падводы за таварам, дайце нам зарабіць і мы ўнясём належны пай».

Загатоўка сыравіны і пушніны праходзяць найлепей. Зараз ужо дадзенае заданьне па загатоўцы скураной сыравіны і пушніны выканана амаль поўнасьцю.

З загатоўкамі зернавых прадуктаў каапэратыў мае надзею справіцца.

Цяпер, калі каапэратыў пачаў прымаць рызьвё, шчаціну, волас, сяляне нясуць усё гэта выключна ў каапэрацыю, дзе іх не абмануць. **А—р.**

С. Маільна, Узьдзенскі р., Менчыына.

5661000 РУБ. НА ЖЫЛЬЛЁВАЕ І КАМУНАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА.

На жыльлёвае будаўніцтва адпушчана 3261000 руб.—Дадаткова адпушчана 190000 руб. на пабудову трамвая.—На камунальнае будаўніцтва адпушчана 2055000 руб.

Канчаткова зацьверджан плян крэдытаваньня жыльлёвага і камунальнага будаўніцтва па БССР на бягучы гаспадарчы год. Згодна гэтага пляну, на жыльлёвае і камунальнае будаўніцтва сёлета будзе адпушчана досыць буйная сума—5661000 рублёў.

Крэдыты на будаўніцтва разьмеркаваны наступным чынам: на жыльлёвае будаўніцтва—57,6 проц., на камунальную гаспадарку—36,3 проц. і на мясцовую прамысловасьць—6,1 пр. агульнай сумы.

Крэдыты на жыльлёвае будаўніцтва акруговых выканкомаў у першую чаргу вызначаны на скачэньне капітальных работ, распачатых у мінулым годзе (Менск, Віцебск, Гомель). Усяго-ж на жыльлёвае будаўніцтва ў акругах асыгнавана 1.300.000 руб.

Упяршыню сёлета праз Белкамунбанк будзе праводзіцца крэдытаваньне жыльлёвага будаўніцтва рэспубліканскай прамысловасьці, на што адпушчана 450000 руб. Жыльлёвая каапэрацыя з агульна-саюзнага крэдыту атрымае 400000 руб. і, апрача таго, на гэты від будаўніцтва са спэцыяльных сродкаў БССР ёсьць 911000 руб. Такім чынам, на ўсе віды жыльлёвага будаўніцтва, ня лічачы спэцыяльных фондаў прамысловасьці, будзе выдадзена 3261000 руб.

Распачатыя летась у Менску работы па каналізацыі будуць ня толькі працягнуты, але і ўзмоцнены; апрача асыгнаваньняў па бюджэту, на гэтую патрэбу Менскаму акрвыканкому будзе адпушчан доўгатэрміновы крэдыт у сумэ 750000 руб.

У часе перавыбарнай кампаніі мінулага году на ўсіх рабочых сходах узмоцнена абгаварвалася пытаньне паляпшаньня водаправоднай сеткі і неабходнасьць распачаць работу па будаўніцтву трамвая. Для ажыцьцяўленьня дырэктыў рабочых арганізацый сёлета адпускаецца крэдыт на пашырэньне водаправоду 115000 руб. і дадаткова да бюджэтных асыгнаваньняў на работы па будаўніцтву трамвая 190000 руб. Усяго-ж на камунальнае будаўніцтва па БССР Камунальны банк адпусьціць 2055000 руб.

Зараз разглядаецца пытаньне аб пабудове водаправоду ў Полацку і ёсьць усе падставы да таго, што сёлета гэтыя работы распачнуцца.

Апрача таго, у бягучым годзе будзе скончана будаўніцтва водаправоду ў Бабруйску.

Дагэтуль у нашым будаўніцтве пераважа аддавалася праўляным пабудоўкам, але ў нас ёсьць усе магчымасьці да пераходу ў будаўніцтве на цэглу і інш.

На разьвіцьцё апошняга сёлета адпускаецца звыш 200000 руб. (на пашырэньне цагельных заводаў).

Падрыхтоўка да будаўнічага сэзону на акругах сёлета праведзена большменш пасьпяхова. Значную частку будаўнічых матар'ялаў (цэмант, жалеза) даставіў у акругі непасрэдна Белкамунбанк.

У заключэньне неабходна зазначыць, што акругі да гэтага часу яшчэ не прадставілі дакладных плянаў на праектаванае будаўніцтва, што можа адбіцца на выкананьні дырэктыў аб распачатку будаўнічага сэзону з 15 красавіка.

У САВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

(Пасяджэньне 20-га лютага г. г.).

На гэтым пасяджэньні разам з іншымі былі разгледжаны наступныя пытаньні.

АБ ПРАКТЫЦЫ СТУДЭНТАЎ ФАКУЛЬТЭТУ ПРАВА І ГАСПАДАРКІ БДУ.

Па хадайніцтву НК Асьветы Савет Народных Камісараў прызнаў магчымым надаць права біраўнікам дзяржаўных і іншых устаноў даваць служачым-студэнтам Факультэту Права і Гаспадаркі БДУ 2-хмесячны водпуск для праходжаньня стажу, уключаючы сюды і чарговы водпуск, без захаваньня заработнай платы за водпуск больш чарговага, але каб гэты водпуск ня шкодзіў працы ўстановы.

АБ ПЕРАДАЧЫ САДОВА-ГАРОДНЫХ ГАСПАДАРАК У ПРАЦОЎНАЕ КАРЫСТАНЬНЕ.

СНК прыняў унесены НК Земляробства праэкт пастановы СНК БССР аб перадачы ў працоўнае карыстаньне садова-гародных гаспадарак, якія ўваходзяць у склад дзяржаўнай ямельнай маемасьці мясцовага значэньня.

Паводле гэтай пастановы садова-гародняя гаспадарка да 2-х гэктараў перадаюцца, як правіла, калектывам, але ў паасобных выпадках, пры немагчымасьці арганізацыі калектываў, такія садова-гародныя гаспадаркі могуць быць перададзены аднадворным гаспадаркам інвалідаў грамадзянскае вайны, былых чырвоных партызан, чырвоных гвардыйцаў і герояў працы. Зямля садова-гародных гаспадарак перадаецца ў працоўнае карыстаньне зараз-жа, а зробленыя дагаворы на сады застаюцца ў сіле да 1 кастрычніка 1928 г.

Садова-гародныя гаспадаркі з плошчай садоў больш 10 гэктараў перадаюцца ў склад Белсельтрэсту для арганізацыі дзяржаўных паказальных садова-гародных гаспадарак. НК Земляробства даручаецца пры арганізацыі такіх паказальных садова-гародных гаспадарак узяць пад увагу патрэбу мець такія гаспадаркі ня менш, як па 1 у кожным раёне.

Калі НК Земляробства будзе прызнана немэтазгоднай арганізацыяй дзяржаўнай паказальнай гаспадаркі, то такая гаспадарка павінна быць перададзена ў працоўнае карыстаньне.

НК Земляробства і акрвыканкомам даручаецца арганізоўваць калектывы для эксплёатацыі садова-гародных гаспадарак выключна з бяднейшага вясковага і местачковага насьлельня з найбольшым уцягненьнем у гэтыя калектывы часткі насьлельня, якое карыстаецца дапамогаю дзяржавы, як: інваліды вайны і іх сем'і, інваліды працы, беспрацоўныя і інш. Белсельсаюзу даручаецца забясьпечыць належнае абслугоўваньне садова-гародных калектываў, а НК Земляробства і акрвыканкомам забясьпечыць калектывы агранамічнаю дапамогаю. Перадача садова-гародным калектывам будынкаў, садовых насаджэньняў, а таксама прадпрыёметы, якія знаходзяцца на тэрыторыі садова-гародных гаспадарак, павінны праводзіцца на падставе пастановы ЦВК і СНК СССР за 16 сакавіка 1927 г., а таксама на падставе пастановы ураду БССР.

АБ МЕСЯЧНІКУ ДАПАМОГІ ДЗЕЦЯМ.

На пасяджэньні 2 лютага 1928 г. Прэзыдыум ЦВК БССР згадзіўся з прапановаю Цэнтральнай Камісіі Дапамогі Дзецям аб правядзеньні ў БССР месячніку дапамогі дзецям.

На гэтым пасяджэньні СНК разглядзеў унесены ЦК Дапамогі Дзецям праэкт пастановы і прызнаў, што правядзеньне месячніку дапамогі дзецям павінна ісьці па лініі прыцягненьня грамадзкіх сродкаў і праверкі становішча дзіцячых устаноў. Прызнаючы, што прыцягненьне сродкаў пры правядзеньні месячніку не павінна ісьці па лініі надбавак, СНК даручыў Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі ўзгодніць з НК Фінансаў усе фінансавыя пытаньні, зьвязаныя з правядзеньнем месячніку.

АБ ПЕРАГЛЯДЗЕ ВЕЛІЧЫНІ СКІДАК З КВАТЭРНАЙ ТАКСЫ.

Урадам СССР даручана пераглядзець велічыню скідак з кватэрнай таксы ў залежнасьці ад разьмеру заработнай платы. Для распрацоўкі меркаваньняў ураду БССР па гэтаму даручэньню, СНК склаў камісію, якой запрапанавана падаць на пасяджэньне СНК 22 лютага г. г. свае канкрэтныя прапановы.

АБ ФІЛІАЛУ ДЗЯРЖБАНКУ Ў Г. СЛУЦКУ.

Эканамічнай Нарадаю пры СНК БССР было ўнесена хадайніцтва Бабруйскага АВК аб застаўленьні ў гор. Слуцку філіалу Дзяржаўнага Банку. Маючы на ўвазе ўзмацненьне загатовак па Слуцкай акрузе, Эканамічная Нарада падтрымоўвае гэтае хадайніцтва.

СНК пацьвердзіў ранейшую сваю пастанову за 24 верасьня 1927 г. па гэтым пытаньні, г. зн. аб застаўленьні ў г. Слуцку на час загатоўчай кампаніі бягучага году філіялу Дзяржаўнага Банку.

НК Фінансаў запрапанавана прысьпешыць паданьнем у СНК канкрэтных прапаноў аб крэдытных апэрацыях у раёнах.

У ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЗЕ ПРЫ СНК БССР.

(*Пасяджэньне за 20 лютага г. г.*)

АБ АГНЯТРЫВАЛЫМ І СЕЛЬСКІМ БУДАЎНІЦТВЕ.

Эканамічную Нараду быў заслуханы даклад ЦК Земляробства і Дзяржляну аб становішчы агнятрывалага і сельскага будаўніцтва ў БССР.

З дакладу высьветлена, што за справаздачны 1926-27 г. становішча сельскага будаўніцтва значна палепшылася.

Так, было арганізавана 79 таварыстваў агнятрывалага будаўніцтва, замест меркаваўшыхся 49, быў перавышаны плян цэгляных вырабу агнятрывалых матар'ялаў (пустацелых цэглін і бэтонных кольцаў) і расплянавана пры земляўпарадкаваньні 573 насёлкі замест 408 меркаваўшыхся на пляну.

Разам з гэтым былі зроблены захады да стварэньня агнятрывалага будаўніцтва паказальнымі для насьлельня. У прыватнасьці кошт агнятрывалых будынкаў у залежнасьці ад мясцовых умоў складаў: водамсьцьвенных жылых ад 10 да 14 руб. за куб. мэтр, а халодных ад 6 да 7 руб., а калі гэтыя работы выконвалі непасрэдна сяляне (без найму будаўнікоў), то кошт гэтых будынкаў быў тавьней на 30-50 проц. супроць кошту водамсьцьвеннага будаўніцтва.

На 1927-28 г. у галіне сельскага і агнятрывалага будаўніцтва міркуецца правесьці наступныя работы: расплянаваць пры правядзеньні земляўпарадкаваньня 1581 насёлак з 30628 двароў.

У галіне агнятрывалага будаўніцтва міркуецца арганізаваць 34 таварыствы агнятрывалага будаўніцтва, якімі прадугледжваецца пабудаваць: 28 бэтонных майстэрняў саматужнага тыпу, 30 цэгляных заводаў, 11 заводаў ванны і 4 заводы па вырабу гончарнай чарапіцы.

Агульная вытворчасьць усіх прадпрыемстваў па вырабу агнятрывалых матар'ялаў у 1927-28 г. складае 18300 кольцаў для студняў, 2750 тыс. шт. цэментнай чарапіцы, 11878 тыс. шт чырвонай цэглы, 151 тыс. шт. пустацелай цэглы, 254 тон ванны і 260 тыс. шт. гончарнай чарапіцы.

Гэтым вырабам прадугледжваецца абслужыць 93 ведамсьцьвеных будынкі, 490 сялянскіх агнятрывалых будынкаў і г. д.

У галіне сельскага водазнабжэньня міркуецца ўпарадкаваць 1012 бэтонных студняў і 15 буравых студняў.

На правядзеньне работ міркуецца адпусьціць 119.613., з іх 21.350 на дзяржаўным бюджэце. 60 тыс. р. з сродкаў Дзяржстраху і 38.263 р. па мясцовому бюджэту.

Звыш таго, на крэдытнаму пляну Белсель банку міркуецца адпусьціць крэдытаў на сельскае і агнятрывалае будаўніцтва 2.680 тыс. руб., з іх на агнятрывалае будаўніцтва і паданьне агнятрывалаасьці існуючым будынкам 480 тыс. руб., на перанос будынкаў насьленьню, якое земляўпарадкоўваецца 900 тыс. руб. і на перанос будынкаў пры перасяленьні 200 тыс. руб., на дастаўку вады 50 тыс. руб., на будаўніцтва бяднейшаму неземляўпарадкаванаму насьленьню на сельска-гаспадарчыя будынкі 750 тыс. руб. і на вытворчасьць будаўнічых агнятрывалых матар'ялаў 300 тыс. руб.

Эканамічная Нарада пастанавіла прыняць у аснову гэты плян сельска-гасп. і агнятрывалага будаўніцтва на 1927-28 г.

Разам з гэтым Эканамічная Нарада запрапанавала НК Земляробства зьвярнуць увагу на неабходнасьць прыняцьця адпаведных мер для паталеньня будаўніцтва і павышэньня якасьці работы і на неабходнасьць узмацненьня ўтварэньня каапэрацыйных таварыстваў і прыцягненьня мясцовых сродкаў на будаўніцтва. У сельскім і агнятрывалым будаўніцтве павінен быць захаваны клясавы прынцып з тым, каб беднята мела перавагу перад іншымі групамі.

Паколькі агнятрывалае будаўніцтва вельмі важна для насьлельня і што ў разьвіцьці яго запінаўлена дзяржаўнае страхаваньне, Эканамічная Нарада пастанавіла абавязаць Белдзяржстрах за рахунак сваіх прыбыткаў распачаць у 1927-28 г. пабудову паказальных агнятрывалых будынкаў у кожным раёне (для школы або сельсавету).

Эканамічная Нарада прызнала неабходным, каб крэдыты, якія адпускаюцца на агнятрывалае будаўніцтва, выдаваліся з такім разьлікам, каб яны былі скарыстаны ў бягучым будаўнічым сэзоне.

АБ КАМІТЭЦЕ САДЗЕЙНІЧАНЬНЯ ГРАМАДЗКАМУ ХАРЧАВАНЬНЮ.

Надаючы вялікае значэньне справе грамадзкага харчаваньня, Эканамічная Нарада пастанавіла ўтварыць Камітэт Садзейнічаньня грамадзкаму харчаваньню пры Эканамічнай Нарадзе БССР у наступным складзе: Старшыня Камітэту—Старшыня Эканамічнай Нарады т. Карклін і члены: т.т. Чаркаскі і Мацыеўскі ад саюзу народнага харчаваньня, Тканова, Хазановіч, Айзенштадт, Марголіна і Сулькіна ад ЦСПСБ, Консон ад Белкаапсаюзу, Пінхасік ад Белрабсэкцыі, Альпэровіч ад Жападдзелу ЦК, Галкін ад ЦК Гандлю, Магілёўчык ад ЦК Аховы Здароўя, Аболіна ад НК Асьветы, Царонак ад ВСНГ, Горын ад Дзяржпляну, Манусевіч ад НК РСІ і Зінгерман—МЦРК.

У аб'яднаньні беларускіх пісьменьнікаў „Полымя“.

У нязелю 19-II адбыўся сход пісьменьнікаў «Полымя». Заслуханы справаздачы груп, якія былі камандыраваны ў Бабруйшчыну і Аршаншчыну.

Па запрашэньні украінск'х пісьменьнікаў вызначана група пісьменьнікаў для паездкі ў Харкаў у наступным складзе: Янка Купала, Якуб Колас, Ц. Гартны, М. Чарот і М. Зарэцкі.

Нашы пісьменьнікі будуць прысутнічаць на ўрачыстым сьвяце, прысьвечаным памяці Тараса Шэўчэнкі, і затым у літаратурным будынку будзе наладжан вялікі вечар беларускае літаратуры.

Хроніка.

У ЦК Мопр'у БССР.

Папярэднія вынікі кампаніі дапамогі політвязьням.

Водгук папярэдніх даных, зімовая кампанія дапамогі палітвязьням Заходняй Беларусі і Польшчы шырока разгарнулася.

Так, ад Менскай акругі паступіла 4.000 р., Гомельскай—1.000 руб., Аршанскай—798 руб. і Віцебскай—400 руб. Кампанія працягваецца.

Сходы пратэсту.

У апошні час па ўсёй БССР адбыліся масавыя сходы сяброў ячэек Мопру ў сувязі з працэсам „133“. Так, у Менску адбылося каля 100 масавых сходаў, на якіх прысутнічала да 5.000 чал.

На сходах вынесены рэзалюцыі аб аказаньні дапамогі палітвязьням буржуазнай турмаў.

7.000 руб. на дапамогу палітвязьням Заходняй Беларусі і Польшчы.

Учора Цэнтральны Камітэт Мопр'у БССР перавёў 7.000 руб. на дапамогу палітвязьням Заходняй Беларусі і Польшчы.

Прыезд у Менск тав. Ягорава.

Сёньня, 22 лютага, у „Кутку вучоных“ (Камуністычная, 19, б) адбудзецца агульны сход навуковых працаўнікоў г. Менску, прысьвечаны 10-хгодзьдзю Чырвонай арміі.

З дакладам на тэму: «НАВУКОВЫЯ ПРАЦАЎНІКІ І АБАРОНА КРАІНЫ» выступіць намандуючы БВА і член РВС СССР тав. ЯГОРАЎ.

Бэконны завод будзе пабудован у Воршы.

Наркамзем канчаткова пастанавіў, што бэконны завод будзе пабудован у Воршы. Такім чынам, усякія дыскусіі, узьнятыя вакол пытаньня аб выбары месца для бэконнага заводу, спыняюцца.

371.000 р. на новае будаўніцтва.

У бягучым годзе Беларускі жыльлёвы саюз разгортвае шырокае жыльлёвае будаўніцтва. Згодна пляну, на новае будаўніцтва будзе адпушчана 371.000 руб.

Перасяленьне яўрэяў.

У Камзет БССР за апошні час паступіла шмат заяў ад яўрэяў розных мястэчак і гарадоў БССР аб жаданьні перасяліцца ў Бірска-Біджанскі раён (Далёкі Ўсход). У бліжэйшым часе Камзет мяркуе адправіць першую партыю перасяленцаў.

Забесьпячэньне БССР хлебам.

Цэрабсэкцыя адпусьціла для рабочай каапэрацыі БССР на сакавік 200 вагонаў жыта і 125 вагонаў пшанічнай мукі. З гэтай колькасьці Менск атрымае 40 вагонаў жыта і 25 вагонаў пшанічнай мукі.

Прамтавары для спажывецкай каапэрацыі.

Белкаапсаюз для забесьпячэньня спажывецкай каапэрацыі мяркуе ў II квартале закупіць розных прамтавараў на 4.405.000 рублёў.

Новы крахмальна-патачны завод.

ВСНГ адпусьціў 60 тысяч руб. на пабудову ў Гомелі крахмальна-патачнага заводу. Пабудоўка заводу распачнецца сёлета.

ЗДАРЭНЬНІ.

ЗГАРЭЎ БУДЫНАК СЕЛЬСАВЕТУ.

У в. Гарбачова (Полаччына) згарэў будынак, дзе зьмяшчаліся сельсавет, пошта і хата-чытальня. Пагаралі ўсе справы сельсавету. Маемасьць пошты здаравана. Страты ад пажару—5000 руб. Прычына высьвятляецца.

СУД.

Працэс 16 бандытаў.

Першы дзень.

20-га лютага ў Менскім акруговым судзе расначаўся працэс бандыцкай шайкі, на чале якой стаяў Паўла Паўлючэнак. Пасьля зачытаньня абвінавальнага акту суд да позняй ночы дапытваў галоўных бандытаў—Паўлючэнка, Прахарчука і Крука. Банда арудавала ў Чэрвенскім і Сьмілаўскім раёнах, але сягала і за межы Менскай акругі.

Хто такі Паўлючэнка?

Бандыт Паўлючэнка паходзіць з сялян Забалацкай воласьці, па прафэсіі—справавод-канторшчык. Жыў у розных мясцох Савецкага Саюзу, але маючы даўгія рукі, відзе ня мог утрымацца. У 1923 годзе Паўлючэнка прыстасаваўся справаводам Грабёнскага валаснога выканкому (па вайсковай часьці). Хутка ён зьнюхаўся з розным злачынным элементам. Кулакі і іх сынкі-дэзэртыры былі лепшымі сябрамі Паўлючэнка: ён з імі піў самагон, выдаваў ім падложныя вайсковыя дакументы, павялічваў і паменшаў гады нараджэньня і, гэткім чынам, «выручаў» ад службы ў Чырвонай арміі.

Памочнік Паўлючэнкі, Панас Прахарчук, паходзіць з вядомай бандыцкай сям'і. Ён вербаваў дэзэртыраў (сам быў таксама дэзэртыр); ён дапамагаў Паўлючэнку ў яго «працы», цэляючыся з ім хабарамі. Хутка гэтыя справы Паўлючэнкі і Прахарчука выплылі наверх, прычым яны папаліся пад суд і былі засуджаны на розныя тэрміны зьняволеньня.

Пасьля хабарніцтва і п'янкі ня смачна паказалася Паўлючэку і Прахарчуку ў папраўчым доме: знаходзячыся на работах у калёніі Сьляпянка, яны ўцяклі. Здабыўшы зброю—абрэзы, рэвальвэры і інш., знайшлі трэцяга сябра, Ліванова Крука, і заселі ў лесе. На начах яны зьяўляліся ў вёскі, на хутары, выходзілі на шлях, затрымівалі праходзячых і праязджых і, пагражаючы забойствам, забіралі грошы, адзеньне і інш. У вёсках ка[illegible] і нават буйную жывёлу.

У хуткім часе ўся гэта банда была пераловлена і папала на лаўку падсудных.

Д. Кастроў.

БІБЛІАГРАФІЯ.

„10 ГОД ЧЫРВОНАЙ АРМІІ“.-БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА. МЕНСК 1928 году. ЦАНА 25 кап.

Да 10-годзьдзя Чырвонай Арміі Беларускім Дзяржаўным Выдавецтвам выпушчана брашура „10 год Чырвонай Арміі“.

У сучасны момант, калі сярод працоўных мас шырока разгарнулася балеван падрыхтоўка да абароны краіны, адчуваецца вялікі недахват вайсковай літаратуры на беларускай мове. Недахват вайсковай літаратуры адчуваецца як у горадзе, так і асабліва ў вёсцы. Вось чаму брашура «10 год Чырвонай Арміі» зьяўляецца вельмі каштоўнай. Яна зьявіцца значнай дапамогай гурткам вайсковых ведаў, вайсковым кутам, страхковым гурткам, хатам-чытальням, клюбам і нардамом, яцэйкам ТДА-Авіяхіму і г. д. у справе вывучэньня гісторыі Чырвонай Арміі.

На ўсе запытаньні як-та: роля Чырвонай Гвардыі; роля камуністычнай партыі як арганізатара і правадыра Чырвонай Арміі; баявы шлях Чырвонай Арміі (пэрыяд грамадзянскай вайны); Чырвоная Армія на палёх Беларусі; Чырвоная Армія на перадпошкі; партыйная і палітычная праца ў Чырвонай Арміі і інш.—на ўсе гэтыя запытаньні кожны палітпрацаўнік як горад, так і вёскі, кожны кіраўнік ваеннізаваных настаўнік, вучань, рабочы і селянін знойдзе ў гэтай брашуры дакладны і зразумелы адказ. Напісана брашура простай і зразумелай беларускай мовай.

Гэту брашуру трэба, як мага, больш распусьціць у самыя шырокія гушчы працоўных мас—на прадпрыемствах і ў вёсцы.

Гісторыю Чырвонай Арміі, гісторыю барацьбы Чырвонай Арміі за ўладу Саветаў павінны ведаць усе працоўныя. Гэтаму значна дапаможа сваячасовы выпуск брашуры „10 год Чырвонай Арміі“.

М. Ш.

Абавяшчэньні.

У чацьвер, 23-га лютага, у 7 гадзін увечары, у памяшканьні Акругкому МОПР (Савецкая 87, другі паверх) склікаецца пасяджэньне прэзыдыуму па пытаньні аб папярэдніх выніках зімовай дапамогі і аб падрыхтоўцы да правядзеньня дню 18-га сакавіка. Яўка членаў прэзыдыуму і членаў Гар. райкомаў абавязковая. Запрашаюцца гар. актывісты МОПР'у.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— У суботу, 25-га лютага—вечар, прысьвечаны дзесяцёхгодзьдзю Чырвонай арміі.

Уваход па білетах, разьмеркаваных па групкомах і мясцкомах.

Пачатак роўна а 7 з пал. гадзіне.

Папярэджваецца, што ў 7 гадз. 45 кв. уваход у залю будзе зачынен.

— Сёньня, 22 лютага—чарговыя заняткі на курсах ленінізму.

Пачатак роўна а 7 з пал. гадзіне.

— Сёньня, 22 лютага, у памяшканьні Дому Асьветы а 7-й гадз. вечара адбудзецца чарговы дэлегацкі сход Гарадзкога райёну ўсіх трох груп.

Яўка ўсіх дэлегатаў абавязкова і без спазьненьня.

— Сёньня, 22 лютага—кіно „Синий платок“. Сеансы—7 з пал. і 9 з пал. гадзіны. Карціну суправаджае музыка.

ПЭДГАБІНЭТ.

— Сёньня, 22-2, а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца сход настаўнікаў прыродазнаўства. На парадку дню даклад на тэму: «Народы жывёлы, прыстасаваныя да ўмоў Беларусі».

— У чацьвер, 23 лютага, а 7 г. увечары—сход ГРАМАДАЗНА�ЎЧАГА гуртка і кампэтэнтуру.

Парадак дню: прапрацоўка грамадазнаўчага матар'ялу ў праграмах I і II груп.

Дакладчыкі т. т. Піліпік і Тумізовіч.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР.

Чацьвер, 23 лютага „БОТВИН“.

Білеты ў касе тэатру.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». ГРАНДЫЁЗНЫ ФІЛЬМ „ХАЗ-ПУШ“ ХУТКА! «Парижский сапожник». Звыш праграмы «КРЫМ ЗОВЕТ» Землятрасеньне ў Крыме.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“. ГРАНДЫЁЗНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ „ПРОВОКАТОР“ («У ПАУТИНЕ») драма ў 7 частках. Пачатак сэансаў у 6, 7 з пал., 9 і 10 з пал. гадз. веч.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». БЫТАВЫ ФІЛЬМ „ОРДЕР НА ЖИЗНЬ“ драма ў 6 част. Звыш праграмы—КІНО-ХРОНІКА САВКІНО (апошні выпуск). Пач. сэансаў у 7, 8-45 і 10 з пал. гадз. веч.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“. Новы мастацкі баявік „Конец Санкт-Петербурга“. Драма ў 7 частк.

Ошскі Кантонны Зямельны Аддзел К.А.С.С.Р.

ШУКАЕ АГРАНОМА

Нікіфара Анісімавіча ІСАЕНКА,

які атрымаў 17-га студзеня з касы Ошскага Агентства Дзяржбанку на выдатку на абсталяваньні вопытнага поля крэдыты ў суме каля 2700 руб. і сьпіхуся невядома куды. Пры паступленьні Ісаенка на службу ў Ошкачэзем 17 сьнежня 1927 г. ён прад'явіў яўна фальшывыя дакументы, выдадзеныя Сурхандар'інскім Акрземаддзелам, што высьветлілася ўжо пасьля таго, як Ісаенка ўцёк.

Просьба да ўсіх дзяржаўных і грамадзкіх устаноў, у выпадку зьяўленьня Ісаенка, прыняць меры да затрыманьня і прыцягненьня яго да крымінальнай адказнасьці.

ПРЫМЕТЫ ІСАЕНКА: на правай руцэ няма мезенага пальца, на барадзе—сьвежы рубец, нізкага росту, брунэт, 32-х год.

МЕНСКІ АКРУГОВЫ ІНСПЭКТАР ГАНДЛЮ ДАВОДЗІЦЬ ДА ЎСЕАГУЛЬНАГА ВЕДАМА, што ім на падставе палажэньня аб гандлёвай рэгістрацыі 17 лютага 1928 г. унесена ў кнігу „Е“ 3-га разьдзелу гандлёвага рэестру СССР па

—— Менскай акрузе пад № 23 ——

МЕНСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ДЗЯРЖАЎНАГА ЭЛЕКТРАТЭХНІЧНАГА ТРЭСТУ.

Апэрацыі філіала: мантажна-тэхнічныя работы і продаж электра-матар'ялаў.

Месцазнаходжаньне: Менск, рог Камсамольск. і Савецк., № 68/29.

Менскі Акр. інспэктар гандлю ДАНІШЭЎСКІ

Галоўлітбел 302. 1-я Дзяржаўная друкарня.